

У. А. Арлоў

# ПРЫСУД ВЫКАНАЎ НЕВЯЛОМЫ

## Ігнат Грынявіцкі

KAMUNIKAT.org

МІНСК
«НАВУКА І ТЭХНІКА»
1992

ББК 63.3(2)51
А 82

Весной 1881 года весь мир облетело эхо взрыва на Екатерининском канале в Петербурге. В столице Российской империи был убит Александр II. Приговор, вынесенный царю революционерами-народовольцами, привел в исполнение белорусский дворянин Игнат Гриневицкий (1856—1881). Книга рассказывает о трагическом жизненном пути этого мужественного человека, близкого соратника С. Перовской и А. Желябова.
Для широкого круга читателей.

Навуковы рэдактар
доктар гістарычных навук А. П. Грыцкевіч

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук М. В. Біч,
кандыдат гістарычных навук У. П. Амяльянчык

*На франтыспісе — фотапартрэт І. Грынявіцкага канца 70-х гадоў XIX стагоддзя*

**Арлоў У. А.**
**А** 82 Прысуд выканаў невядомы: Ігнат Грынявіцкі.—Мн.: Навука і тэхніка, 1992. — 52 с., [8] арк. іл.— (Нашы славутыя землякі).
ISBN 5-343-00883-6.

Орлов В. А. Приговор привел в исполнение неизвестный: Игнат Гриневицкий.

У кнізе апавядаецца пра трагічны лес рэвалюцыянера-нарадавольца І. Грынявіцкага (1856—1881), які выканаў смяротны прысуд Аляксандру II.
Для шырокага кола чытачоў.

0503020300—105
А______________168-91 ББК 63.3(2)51 + 63.3(2Б)
М316(03)-92

ISBN 5-343-00883-6 © У. Арлоў 1992

# ПРАДМОВА

У 1884 годзе ў Пецярбурзе пачаў выходзіць падпольны гектаграфічны часопіс «Гомон», орган беларускай фракцыі таемнай арганізацыі «Народная воля». На яго старонках з рэвалюцыйна-дэмакратычных пазіцый гаварылася пра існаванне беларускай нацыі і гучала патрабаванне яе федэратыўнай самастойнасці пасля знішчэння царызму. Выдаўцы «Гомона»* пісалі, што беларускі народ можа адчуваць няверу ў свае сілы, але адсутнасць у ягоных масах нацыянальнага руху — яшчэ не сведчанне яго нібыта адвечнай дрымотнай пасіўнасці. Часопіс нагадваў пра барацьбу беларускіх царкоўных брацтваў з акаталічваннем, пра магутныя сялянскія бунты супроць прыгону і нацыянальна-вызваленчыя паўстанні за часамі Мікалая I і Аляксандра II.

Заклікаючы народ да барацьбы за сацыяльныя і нацыянальныя ідэалы, «гоманаўцы» называлі «адным з гарачых заснавальнікаў» сваёй фракцыі Ігната Грынявіцкага, які 1 сакавіка 1881 года, выконваючы прысуд «Народнай волі», забіў імператара Аляксандра II, пераняжыўшы яго ўсяго на некалькі гадзін.

У параўнанні з імёнамі ад школьных гадоў вядомых нам нарадавольцаў Андрэя Жалябава, Соф'і Пяроўскай, Мікалая Кібальчыча наш суайчыннік Ігнат Грынявіцкі дагэтуль застаецца ў цені. Немалую ролю тут, відаць, адыграла тое, што ў часе судовага працэсу па справе 1 сакавіка сапраўднае імя царазабойцы ящчэ заставалася нявыяўленым. Дзякуючы добра наладжанай у вярхах «Народнай

* *«Гомон» №№ 1, 2 // Публицистика белорусских народников. Мн., 1983.*

волі» канспірацыі, а таксама мужнасці Грынявіцкага ў апошнія хвіліны жыцця, высветліць яго імя паліцыі ўдалося толькі праз два месяцы пасля выбуху на Кацярынінскім канале.

Набліжаючыся з бомбаю ў руках да Аляксандра II, Ігнат ведаў, што і сам не мае ніякіх шанцаў уратавацца, але, у адрозненне ад некаторых паплечнікаў, да канца захаваў вытрымку і цвёрдасць.

Было б памылкаю бачыць у Грынявіцкім асобу другарадную, чалавека, што ў вырашальны момант апынуўся на патрэбным месцы ў выніку выпадковых абставін. Такім поглядам пярэчыць само ягонае жыццё, да канца ахвяраванае ідэі справядлівага пераўтварэння свету, якая спарадзіла не толькі прыклады высокага гераізму, але — як нам добра вядома — і нечуваную да таго хвалю крывавага насілля.

Мары пра новае грамадства, заснаванае на прынцыпах свабоды, роўнасці і братэрства, маглі захапіць юнака яшчэ ў гімназічныя гады. Паступленне ў сталічны Тэхналагічны інстытут, працавітасць і вялікія здольнасці да навукі абяцалі яму ў будучым спакойнае незалежнае жыццё і магчымасць бліскучай кар'еры. Але ён зрабіў іншы выбар.

Уступіўшы ў 1879 годзе ў «Народную волю», Грынявіцкі бярэ чынны ўдзел у рэвалюцыйных гуртках, збірае сродкі на патрэбы палітычных вязняў, пашырае падпольную літаратуру і супрацоўнічае ў «Рабочай газеце», працуе ў «нябеснай канцылярыі»— нелегальным пашпартным стале, дзе фабрыкаваліся неабходныя рэвалюцыянерам дакументы. Адначасова ён, прыхільнік тэрарыстычных метадаў барацьбы, уваходзіць у групу, якая дзень пры дні сачыла за выездамі цара, рыхтуючы яго забойства.

Пра апошні, пецярбургскі перыяд жыцця І. Грынявіцкага захавалася даволі багата звестак — дакументы, успаміны таварышаў па падполлі (яны, праўда, зазвычай грашаць на агульнасць характарыстык), матэрыялы паліцэйскіх справаздачаў. Што да гадоў маленства і вучэння ў Беластоцкай рэальнай гімназіі, дык тут асаблівую каштоўнасць маюць сведчанні роднай Ігнатавай сястры Юліі (замужам Пылаевай), атрыманыя аўтарам першай і доўгі час адзінай кнігі пра Ігната Грынявіцкага — біяграфічнага нарыса, што выйшаў у выдавецтве Таварыства паліткатаржан*.



Дарэчы, гэтая кніга, выдадзеная ў час, калі яшчэ жылі блізкія сваякі рэвалюцыянера, дазваляе, на нашу думку, удакладніць імя ягонага бацькі. І. Жукоўскі-Жук паслядоўна называе яго «Иоакимом». БелСЭ і іншыя беларускія выданні (відаць, арыентуючыся на форму «Иоахим», якая таксама сустракаецца ў расейскамоўнай літаратуры) падаюць імя Грынявіцкага-бацькі як Яўхім. Але відавочна, што «Иоаким» правільней перадаць беларускім іменем Якім, як гэта робіць у сваім «Расейска-беларускім (крыўскім) слоўніку» Вацлаў Ластоўскі.

Шэраг невядомых шырокаму чытачу фактаў і дакументаў з жыцця Ігната Грынявіцкага ўвёў ва ўжытак Уладзімір Ліпскі, чыю кнігу** можна аднесці да жанру белетрызаванай біяграфіі.

У гістарычнай літаратуры дагэтуль існуе прыкрая, часам несумленна-наўмысная блытаніна ў пытанні пра нацыянальную прыналежнасць героя «Народнай волі». Шмат якія аўтары, у тым ліку і сучасныя, называюць яго палякам, кіруючыся заганным, але жывучым прынцыпам вызначэння нацыянальнасці жыхароў дарэвалюцыйнай Беларусі паводле іхняга веравызнання. «Польскім дваранінам» называюць Грынявіцкага энцыклапедыі — «Большая Советская» і «Историческая». Унікаючы канкрэтнасці, «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» паведамляе толькі, што рэвалюцыянер паходзіць з дробнамаянтковых дваран. Польскія гісторыкі Наленчы пішуць пра «Ігнацыя Грынявіцкага — паляка, сябра «Народнай волі»***.

Вядомы пісьменнік расейскага замежжа Марк Алданаў у сваім гістарычным рамане «Вытокі»**** укладае ў вусны царазабойцы такія развагі: «Палякі маюць мяне за расейца, а расейцы — за паля-

* *Жуковскйй-Жук. И. И. Игнатий Иоакимович Гриневицкий. М., 1930.*

** *Ліпскі У. Невядомы: Аповесць пра Ігната Грынявіцкага. Мн., 1990.*

*** *Наленч Д. и Т. Юзеф Пилсудский: Легенды и факты. М., 1990. С. 14.*

**** *Алданов М. Истоки // Дружба народов. 1991. № 8—11.*

ка. Я не ведаю, чыя праўда: я проста чалавек. Думаю, што ў будучым такіх людзей, як я, людзей — проста, будзе ўсё болей...» Разам з тым народнік Леў Ціхаміраў успамінаў: «Палякі ўпарта называлі яго «Грынявецкі» і прылічалі да сваіх. Аднак сам ён зваў сябе ліцвінам, а не палякам»*.

Вядома, што ліцвінамі зваліся тады жыхары заходняй і цэнтральнай Беларусі. Але «Гомон» засведчыў: нацыянальная самасвядомасць Грынявіцкага была якасна вышэйшая за краёвы патрыятызм. Як і «гоманаўцы», Ігнат, безумоўна, ведаў пра дзейнасць Кастуся Каліноўскага. Магчыма з некаторымі агаворкамі, але Грынявіцкі мог лічыць сябе прадаўжальнікам ягонае справы.

...З сарака сямі добраахвотнікаў, якія хацелі прынесці сваё жыццё ў ахвяру дзеля перамогі рэвалюцыі, кіраўніцтва «Народнай волі» выбрала чатырох. Сярод іх быў Грынявіцкі.

За колькі дзён да смерці ён пісаў у запавеце: «Я не буду ўдзельнічаць у апошняй барацьбе. Лёс асудзіў мяне на раннюю гібель, і я не ўбачу перамогі, не буду жыць ні дня, ні гадзіны ў тым светлым часе, але лічу, што сваёй смерцю зраблю ўсё, што павінны быў зрабіць, і большага ад мяне ніхто, ніхто на свеце патрабаваць не можа».

Уладзімір Караткевіч, як сведчыць ягонае прысвячэнне ў вершы «Смяротная страта (1 сакавіка 1881 г.)», меркаваў, што Грынявіцкі «сваім выбухам адпомсціў Аляксандру II за 1863 год»...

* *Тихомиров Л. Воспоминания. М.; Л.: Центроархив, 1927.*

# НА ПАЧАТКУ ЖЫЦЦЁВАЙ ДАРОГІ

*Малая радзіма * Спадчына з тысячным доўгам * У сям'і * Пад музыку бацькавай скрыпкі * Беластоцкая гімназія * Неспакойная правінцыя * Найлепшы выпускнік*

Сваёй малой радзімаю Ігнат лічыў вёску і маёнтак Вялікія Грынявічы* у Бельскім павеце Гарадзенскае губерні. Тут ён жыў з васьмігадовага ўзросту, сюды прыязджаў на гімназічныя вакацыі, адсюль выпраўляўся вучыцца ў Псцярбург. У родныя мясціны ён завітае на колькі дзён і перад самаю смерцю.

Бацька будучага рэвалюцыянера-тэрарыста Якім разам з сёстрамі Анэляй ды Эміляй маёнтак Вялікія Грынявічы ўспадчыў з вялікім па тым часе доўгам —1099 рублёў 88 капеек. Змагаючыся з даўгамі, Якім Грынявіцкі здаў сваю зямлю ў арэнду багатаму суседу Саковічу, а сам служыў аканомам ва ўладаннях пана Незабытоўскага на Меншчыне.

Там, у маёнтку Басін Бабруйскага павета, і з'явіўся на свет Ігнась. Здарылася гэта, паводле дакументаў, у 1856 годзе, хоць сястра Юлія і іншыя сваякі называлі іншую дату — жнівень 1855-га.

Пані Бальбіна з роду Дамброўскіх была маці яшчэ шасцярых дзяцей — Вікторыі, Юліі, Эміліі, Казіміры, Яна і Юзіка, які памёр пад час пераезду ў Басін. Па вяртанні сям'і на радзіму памерла і чатырнаццацігадовая Казіміра.

Вялікая радзіна Грынявіцкіх вярнулася ў свой маёнтак пасля таго, як аціхла паўстанне 1863 года. Маёнтак Вялікія Грынявічы стаяў у надзвычай маляўнічым кутку беларускае зямлі: паблізу бегла хуткая рэчка Белая, разлягаліся абшары спрадвеч-

* *Цянер у Беласоцкім ваяводстве Польскай Рэспублікі.*

нае пушчы. З лесам, сенажаццю і сядзібамі спадчынная зямля Грынявіцкіх займала ўсяго 60 дзесяцінаў. У пільніцу гаспадары і дзеці працавалі на палетку разам з парабкамі.

Грынявіцкія жылі ў добрым суседстве з навакольнымі сялянамі. Пан Якім быў чалавек добры і чулы, але характар меў рашучы і цвёрды. Юлія Пылаева (Грынявіцкая) прыгадвала, што, любячы і нават песцячы дзяцей, бацька вымагаў ад іх бясспрэчнага паслушэнства. Зрэшты, дзеці ніколі не пярэчылі, бо патрабаванні бацькавы заўсёды былі справядлівыя.

Гаспадар Вялікіх Грынявічаў любіў гасцей. У ягоным небагатым доме почасту збіралася мясцовая шляхта. Можна ўявіць, што ў часе такіх сяброўскіх вечарынаў у доме гучалі размовы пра паўстанне на чале з Каліноўскім. Згадвалася, відаць, і паўстанне 1830—1831 гадоў — архіўныя дакументы сведчаць, што сярод інсургентаў былі нейкія Грынявіцкія.

Якім Грынявіцкі быў заўзяты скрыпач-аматар. Мусіць, таму ў маёнтку на радасць дзятве ахвотна прымалі вандроўных музыкаў.

Бальбіна Грынявіцкая*, у адрозненне ад мужа, нораў мела незвычайна ласкавы і мяккі. Вольны ад гаспадарчых клопатаў час яна аддавала выхаванню дзяцей. Паводле ўспамінаў сваякоў, найбольш маці уплывала на Ігната, што таксама вылучаўся дабрынёю, мяккасцю і пабожнасцю. Таварыскі, вясёлы і рухавы хлопчык, трохі картавячы, вымаўляў літару «л» і не любіў гульняў у вайну і ў паляванне — наогул, ніякіх ваяўнічых забаваў. За мяккі ласкавы характар сябры дадуць яму ў гімназіі мянушку Коцік, якая захаваецца пазней і ў асяроддзі нарадавольцаў.

У сям'і гаварылі пераважна па-польску, але, жывучы ў прыязнасці з простым людам і не надта розначыся ўзроўнем жыцця з заможнымі сялянамі, усе Грынявіцкія добра ведалі беларускую мову. Разам з польскімі і расейскімі кнігамі ў Вялікія Грынявічы маглі трапляць творы В. Дуніна-Марцінкевіча, папулярныя ў той час ананімныя паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе», «Гутарка двух суседзяў», якая нелегальна выдавалася ў 1861—1862 гадах у Беластоку і ў якой былі такія, напрыклад, радкі — водгук на рэформу 1861 года:

** Памерла ў 1880 годзе, не дажыўшы да сынавай смерці.*



Але цар аб нас не дбае
І на мыслі толька мае,
Каб як усіх ашукаці.
Бо каб хацеў вольнасці нашай,
То бы ён зрабіў іначай...*

Сям'я не ведала праяваў нацыянальнае ці рэлігійнае нецярпімасці, роўныя адносіны былі і з расейцамі, і з яўрэямі. Выхаваную ў маленстве талерантнасць Ігнат захавае на ўсё жыццё.

Як і было зазвычаена ў дваранскіх сем'ях, дзяцей Грынявіцкіх пачыналі вучыць хатнія настаўнікі. Ігнат і ягоны малодшы брат Янка спасцігалі польскую і расейскую грамату пад кіраўніцтвам запрошанай у дом панны Казіміры.

Часам можна сустрэць звесткі пра вучэнне І. Грынявіцкага ў Бельскім пазятовым вучылішчы**, але, здаецца, няма ніякіх падстаў не давяраць Ігнатавай сястры Юліі, якая сцвярджала, што брат у Вельску ніколі не вучыўся, а адразу пасту- --- у Беластоцкае рэальнае вучылішча (гімназію).

Бацька дапамагаў Ігнату адно ў трох першых класах — паўтара рубля на месяц. Потым давялося зарабляць прыватнымі ўрокамі і рэпетытарствам. Навука давалася лёгка, і Грынявіцкі ўвесь час быў сярод лепшых вучняў. Ён выдатна рысаваў і маляваў (пасля гэта спатрэбіцца ў падпольнай «нябеснай канцылярыі»). Марачы пра вышэйшую адукацыю, улетку ён рэдка наведваў бацькаў маёнтак — працаваў дарэктарам у багатых шляхецкіх сем'ях, зарабляючы грошы на заканчэнне гімназіі і далейшае навучанне.

У XIX стагоддзі правінцыйны Беласток няраз даваў расейскім уладам вялікія клопаты. За пяць-

** Гутарка двух суседзяў // Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Хрэстаматыя. Мн., 1988. С. 230. Некаторыя даследчыкі лічаць, што аўтарам гэтага твора мог быць К. Каліноўскі.*

*** Деятели революционного движения в России: Биобиблиографический словарь. Т. 3. Вып. 2. М., 1934.*

дзесят гадоў да таго часу, як па беластоцкіх вуліцах хадзіў гімназіст Грынявіцкі, у горадзе дзейнічала рэвалюцыйнае таварыства «Вайсковыя сябры», створанае шляхцічам Міхалам Рукевічам. Яго ўдзельнікі былі пераважна афіцэры раскватараванага ў Гарадзенскай губерні Літоўскага асобнага корпуса. Сваёю мэтаю «Вайсковыя сябры» лічылі змаганне за «вольнасць і ўсеагульны дабрабыт. У снежні 1825 года таварыства сарвала прысягу Мікалаю І у размешчаных вакол Беластока палках. Катаргу і высылку «Вайсковыя сябры» адбывалі разам з дзекабрыстамі. М. Рукевіч быў засуджаны да пакарання смерцю, якое замянілі дзесяццю гадамі катаргі.

Нямала жыхароў горада і ваколіц бралі ўдзел у наўстаннях супроць царызму. Ігнат мусіў ведаць імёны тых, хто разам з Кастусём Каліноўскім узначальваў барацьбу — паўстанцкіх камандзіраў Валера Урублеўскага і Зыгмунда Серакоўскага. начальніка Магілёўскага ваяводства Людвіка Звяждоўскага, аддзел якога захапіў горад Горы-Горкі на самым усходзе Беларусі. Не выключана, што ў Беластоку або дома, на вакацыях, у рукі Грынявіцкага-гімназіста маглі трапляць і нумары першай нелегальнай беларускай газеты «Мужыцкая праўда», у якой Каліноўскі пад псеўданімам «Яська-гаспадар з-пад Вільні» пісаў: «Падумайце добра да, памаліўшыся Богу, станьма дружна разам за нашую вольнасць! Нас цар ніц не падмане — не падвядуць маскалі: няма для іх у нашых сёлах ні вады, ні хлеба, для іх мы глухія і нямыя — нічога не бачылі і не чулі. А пакуль яшчэ пара, трэба нашым хлопцам спяшыць з віламі да з косамі там, гдзе дабіваюцца волі да праўды, а мы, іх бацькі да жонкі нашы, сцерагчы будзем да ўсведамляць. адкуль на іх сягне нячыстая маскоўская сіла, да ад душы памагаць усялякімі спосабамі дзецюкам нашым, што за нас пойдуць біцца. А будзе ў нас вольнасць, якой не было нашым дзядам да бацькам»*.

Ідэі нацыянальнага вызвалення знаходзілі пад-

* *Мужыцкая праўда № 7 // Беларуская літаратура XIV стагоддзя: Хрэстаматыя. Мн., 1988. С. 225.*

трымку і ў выкладчыкаў Беластоцкай гімназіі*, што пазней была пераўтвораная ў рэальнае вучылішча. Праўда, у часы Грынявіцкага ў гэтай, як і ў астатніх навучальных установах ахопленых апошнім паўстаннем губерняў, склад педагогаў быў грунтоўна «ператрэсены». Сёй-той з выкладчыкаў рэальнага вучылішча насіў медаль «За усмирение польского мятежа».

Тым не менш у выніку даволі шырока разгорнутай у краіне рэвалюцыйнай прапаганды сацыялістычныя ідэі, лозунгі служэння народу даходзілі і сюды. Акалічнасці першага знаёмства І. Грынявіцкага з вучэннем сацыялістаў-народнікаў невядомыя, але яго паплечнікі лічылі, што падмурак поглядаў царазабойцы быў закладзены яшчэ ў старэйшых класах гімназіі.

Адзначым адзін вельмі істотны, на наш погляд, момант — адыход будучага тэрарыста ад рэлігіі. «Выхаваны ў каталіцкай сям'і і пад уплывам пабожнае маці, Грынявіцкі і ў рэальным вучылішчы заставаўся шчырым вернікам і лічыў сябе добрым каталіком, не зважаючы на жарты і кпіны сваіх аднакласнікаў. Аднак з гадамі ягоная вера пачала адміраць — відаць, часткова пад уплывам кніг, але найперш ад кантакту з сацыялістычным асяроддзем, з якім ён сутыкнуўся яшчэ ў Беластоцкай рэальнай гімназіі, і ўжо ў гады студэнцтва ён лічыўся атэістам»**.

У 1875 годзе Грынявіцкі, найлепшы выпускнік гімназіі, едзе ў Пецярбург, каб працягваць навучанне.

* *Выкладчыкам матэматыкі ў гімназіі на той час быў Кароль Чаховіч (гл. кн.: Працька Т. С. Эксперыментатар з Беластоцкай гімназіі. Мн., 1990). Яго раптоўны перавод з Беластока ў Арэнбург, паводле меркавання Т. Працькі, відаць, звязаны з удзелам Ігната Грынявіцкага ў падзеях 1 сакавіка 1881 года.*

** *Жуковский-Жук И. И. Игнатий Иоакимович Гриневицкий. М., 1930. С. 11.*

# ТЭХНАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ

*Мары здзяйсняюцца * Традыцыі вальнадумства * Студэнты і народніцкі рух * Экзамены і адзнакі * «Пакінуць на паўторны курс» * Данясенне быхаўскага пристава*

Дваранін Ігнат Грынявіцкі піша прашэнне на імя дырэктара Санкт-Пецярбургскага Тэхналагічнага інстытута Вышняградскага: «Жадаючы пастуліць у лік сталых слухачоў Інстытута на першы курс механічнага аддзялення і падаючы Вам усе неабходныя дакументы, маю гонар прасіць Вас, спадару Дырэктар, дазволіць мне трымаць уступныя экзамены...»

Сталічны Тэхналагічны інстытут быў на той час адной з самых прэстыжных навучальных устаноў імперыі. Тут рыхтавалі высакакласных інжынераў, тэхнічных кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў. Дыплом гарантаваў забяспечанае жыццё, адкрываў выдатныя перспектывы ўзыходжання па службовай лесвіцы. Бацькі Грынявіцкага, як і ўся сям'я, звязвалі з сынавым ад'ездам у сталіцу вялікія надзеі і планы.

Напачатку здавалася, што ажыццяўленню гэтых надзей нічога не перашкодзіць. Ігнат бліскуча здае ўступныя экзамены: фізіка, алгебра і трыганаметрыя — «выдатна», геаметрыя — «вельмі добра». Такія вынікі дазвалялі інстытуцкаму навучальнаму камітэту вызваліць небагатага студэнта ад платы за слуханне лекцый.

Усё складвалася як найлепей, але праз два з паловаю месяцы, 15 лістапада* 1875 года Грынявіцкага... звальняюць з інстытута. Зрэшты, такі лёс напаткаў усіх першакурснікаў: загадам дырэктара курс распусцілі.

* *Усе даты падаюцца паводле старога стылю.*



Тыднёвы навучальны расклад «тэхнолагаў» быў насычаны і амаль не пакідаў студэнтам вольнага часу: 8 гадзін — рысаванне, па 4 — матэматыка і маляванне, 3 — фізіка, па 2 — багаслоўе, неарганічная хімія, нямецкая мова, нарысная геаметрыя, статыка і асновы дынамікі. Аднак навучальнаму камітэту гэтага было мала. Яго відавочна не задавальняла, што Тэхналагічны меў славу радыкальнай навучальнай установы.

Баючыся пашырэння ў сценах інстытута небяспечных сацыялістычных ідэй, адміністрацыя пачала штотыдзень практыкаваць гэтак званыя рэпетыцыі — своеасаблівыя шматгадзінныя экзамены па галоўных дысцыплінах. На адной з такіх рэпетыцый першакурснікі ўзбунтаваліся і адмовіліся адказваць.

Студэнты мелі і іншыя прычыны для абурэння. Кантралявалася іхняе ліставанне. Наглядчыкі нястомна правяралі гардэроб і вялі ўлік тых, чыёй вопраткі не было на належным месцы. Парадкі былі суровейшыя за гімназічныя.

Скліканае дырэктарам надзвычайнае пасяджэнне навучальнага камітэта пастанавіла: звольніць увесь курс, а праз колькі дзён залічыць назад тых, хто падасць пісьмовую заяву і пагадзіцца выконваць інстытуцкі рэгламенг. Міністр фінансаў, якому падпарадкоўваўся інстытут, ухваліў такое рашэнне.

З інстытута адлічылі 25 студэнтаў — і тых, хто адмовіўся пісаць заявы, і тых, каго, нягледзячы на пададзеныя прашэнні, палічылі нядобранадзейнымі. Дарэчы, у той час у Тэхналагічным працягвала дзейнічаць прынятая пасля паўстання 1863—1864 гадоў інструкцыя, якая рэкамендавала, каб «лік сталых выхаванцаў польскага паходжання не перавышаў 1/10 часткі ўсіх, хто паступіў вучыцца», а таксама патрабавала неадкладнага звальнення ўсіх палітычна ненадзейных. Сярод звольненых быў і Аляксандр Міхайлаў; пазней ён зробіцца адным з кіраўнікоў «Народнай волі», якога таварышы будуць называць галоўным ахоўнікам, «дворнікам» партыі.

Адрасаванае цару данясенне аб падзеях у Тэхналагічным інстытуце захавала рэзалюцыю Аляк-

сандра II: «Спадзяюся, што дзякуючы пільнасці і строгасці цяперашняга начальства падобныя беспарадкі паўтарацца не будуць».

Некалькі дзён лічыўся звольненым з інстытута і студэнт Грынявіцкі. Калі б дырэктар Вышняградскі мог ведаць, што прымае назад будучага забойцу імператара...

Нягледзячы на суровае пакаранне «бунтаўшчыкоў», у інстытуце заставалася шмат незадаволеных. Тэхнолагі памяталі свае традыцыі вальнадумства і не збіраліся ад іх адмаўляцца.

Значныя хваляванні адбываліся тут яшчэ ў 1861 годзе, калі студэнты выступілі супроць стварэння ў вышэйшых навучальных установах адмысловых інспекцый. «Сярод выхаванцаў назіраецца дух свавольства, непаслушэнства і дзёрзкасці супроць улады», — даносіла дырэкцыя міністру фінансаў у 1862 годзе. Праз шэсць гадоў тэхнолагі наладзілі першую студэнцкую сходку, сярод арганізатараў якой быў студэнт механічнага аддзялення Міхаіл Сажын (у эміграцыі стане сакратаром М. Бакуніна, удзельнікам Парыжскай камуны). У 1869 годзе студэнты перадалі дырэкцыі патрабаванні дазволіць сходы і скасаваць паліцэйскую апеку.

Натхнёны падзеямі Парыжскае камуны тэхнолаг Мікалай Ганчароў пісаў у сваёй аркушоўцы «Виселица»: «Да зброі! Сусветная рэвалюцыя пачалася!»

Вольны слухач інстытута Аляксандр Далгушын быў сярод арганізатараў сацыялістычнага гуртка пецярбургскіх рабочых. У сваіх пракламацыях гурток клікаў інтэлігенцыю ў народ, а народ — да паўстання супроць царызму.

За год да прыезду ў Пецярбург І. Грынявіцкага Тэхналагічны пасля студэнцкіх выступленняў наогул часова зачынілі. Адбылася сутычка тэхнолагаў з паліцыяй. З інстытута звольнілі кіраўніка польскага сацыялістычнага гуртка Людвіка Варыньскага.

Нядзіва, што са сценаў гэтай навучальнай установы выйшла шмат вядомых рэвалюцыянераў, людзей з дэмакратычнымі поглядамі. Між іншага ў 1877 годзе дыплом Тэхналагічнага інстытута атрымаў беларускі паэт-дэмакрат Янка Лучына (Неслухоўскі).

Да студэнтаў траплялі нелегальныя выданні. Жывы водгук у іх знаходзілі расейскія палітычныя працэсы. Пецярбургскае студэнцтва было добра знаёмае з гісторыяй народніцкага руху, пачынаючы з «Зямлі і волі» 60-х гадоў.

Юнакі спрачаліся пра погляды галоўных ідэолагаў народніцтва. Адным падабаўся анархізм М. Бакуніна, другія пагаджаліся з П. Лаўровым, які выступаў за грунтоўную падрыхтоўку да рэвалюцыі... Усе ведалі пра Дзмітрыя Каракозава, што 4 красавіка 1866 года зрабіў няўдалы замах на Аляксандра II і быў павешаны.

Выкліканыя замахам арышты, узмацненне цэнзуры і іншыя рэпрэсіўныя захады паліцыі, як вядома, спарадзілі такую вусцішную з'яву, як «нячаеўшчына». У канцы 60-х гадоў вольны слухач Пецярбургскага універсітэта Сяргей Нячаеў разам з Паўлам Ткачовым паспрабавалі падпарадкаваць сабе студэнцкі рух. Нячаеў жыў фанатычнай вераю ў тое, што ўвесну 1870 года Расейскую імперыю чакае новая пугачоўшчына. Ніякіх падстаў для гэтага не было, але рэальнае жыццё мала цікавіла рэвалюцыянераў з арганізацыі пад красамоўнаю назваю — «Народная расправа». Каб мацней з'яднаць таварышаў па падполлі, Нячаеў задумаў і ўчыніў зверскае забойства студэнта Іванова, беспадстаўна абвінаваціўшы таго ў здрадзе.

П. Ткачоў імкнуўся падвесці пад такія рэвалюцыйныя дзеянні тэорыю. Ён, у прыватнасці, лічыў, што пасля поспеху змоўшчыкаў і перамогі сацыялізму велізарная колькасць людзей — усё насельніцтва, старэйшае за 25 гадоў,— будзе непрыдатная да новага, шчаслівага жыцця з прычыны рэлігійных і маральных перажыткаў у свядомасці. Паводле гэтага тэарэтыка, усіх, каму пайшоў 26-ты год (апрача прафесійных рэвалюцыянераў), пажадана было б знішчыць, а каб моладзь магла паказаць сваю прыхільнасць «новаму разумнаму парадку жыцця», дзеці атрымлівалі пераважнае права на ліквідацыю бацькоў*.

С. Нячаеў і П. Ткачоў стаялі «вышэй маралі». Як паказалі далейшыя падзеі, тых, хто падзяляў такія прынцыпы, хто лічыў прыдатнымі для рэва-

* *Гаврилов Ю. Казенный дом // Огонёк. 1989. № 47. С. 14.*

люцыйнай барацьбы любыя метады — ад гнюсных правакацый і шантажу да жудасных забойстваў,— у Расейскай імперыі было нямала.

У супрацьвагу нячаеўцам узнікла таварыства чайкоўцаў, што значную ўвагу надавала этыцы. Чайкоўцы падрыхтавалі «хаджэнне ў народ», у часе якога інтэлігенцыя павінна была падняць паспаліты люд на рэвалюцыю. Ажыццявіць гэтую ўтапічную ідэю спрабавалі каля трох тысяч рэвалюцыянераў-народнікаў.

«Хаджэнне» напаткаў правал: сяляне не ўспрымалі абстрактнае прапаганды, а часам займалі адкрыта варожую да прапагандыстаў пазіцыю. Сотні хадакоў у народ былі арыштаваныя. У Расейскай імперыі прайшлі першыя масавыя палітычныя працэсы. Перад народніцкім рухам паўстала пытанне: што далей?

Але вернемся да студэнта Грынявіцкага, які, безумоўна, быў удзельнікам дыскусій і спрэчак на рэвалюцыйныя тэмы.

Атмасфера інстытута спрыяла хуткай палітызацыі і радыкалізацыі ягоных выхаванцаў, аднак наўрад можна пагадзіцца з думкаю, што Ігнат «з самых першых дзён студэнцкага жыцця ўзяў удзел у студэнцкіх рэвалюцыйных гуртках і цалкам аддаўся гэтай працы»*. Такія сцверджанні выглядаюць звычайным ідэалагічным штампам, добра знаёмым нам з афіцыйных жыццяпісаў дзеячаў рэвалюцыйнага руху.

Грынявіцкі ўдзельнічаў у стыхійным пратэсце супроць рэпетыцый. Разам з іншымі тэхнолагамі ён мог прысутнічаць у снежні 1876 года на малебне за здароўе Мікалая Чарнышэўскага ў Казанскім саборы і слухаць на мітынгу пасля набажэнства прамову студэнта Горнага інстытута Георгія Пляханава. Мог чытаць творы ідэйных правадыроў народніцтва. Але, як кажуць дакументы і ўскосныя сведчанні, на шлях чыннай барацьбы з дзяржаўным ладам Грынявіцкі стаў, відаць, не раней канца 1878—пачатку 1879 года.

Пра тое, што свой выбар Ігнат зрабіў не адразу, сведчаць і ягоныя поспехі ў навучанні. На экзаменах за першы курс ён атрымлівае толькі добрыя і выдатныя адзнакі. Вынікі другога студэнцкага года ўжо трохі іншыя: рысаванне і маляванне — па-ранейшаму «выдатна», кінематыка і будаўнічае мастацтва — «вельмі добра»; нямецкая мова, інтэгральныя вылічэнні, фізіка, тэарэтычная механіка, неарганічная хімія, тэорыя супраціўлення матэрыялаў — «станоўча». Трэці курс: «выдатна» па праектаванні, геадэзіі і практыкуме ў інстытуцкай механічнай майстэрні; «добра» па архітэктуры, тэхналогіі дрэва і тэхналогіі будаўнічых матэрыялаў; гідраўліка, металургія, некалькі іншых дысцыплін — «станоўча».

Такія няроўныя адзнакі відавочна не зусім адпавядалі магчымасцям найлепшага выпускніка Беластоцкай рэальнай гімназіі. Вынікі курсавых экзаменаў, на нашу думку, трэба разглядаць як паказчык пэўных сумневаў студэнта Грынявіцкага ў правільнасці абранага жыццёвага шляху.

У канцы 1873 года Ігнат удзельнічае ў студэнцкай сходцы, што адбылася пасля святкавання 50-годдзя інстытута. Яшчэ на ўрачыстасці, дзе прысутнічалі высокія дзяржаўныя чыноўнікі і асобы імператарскага дому, тэхнолагі ў розных формах дэманстравалі сваю нязгоду з інстытуцкімі парадкамі, што было расцэнена як нелаяльнасць да ўладаў*.

Пасля юбілею пяць студэнтаў мусілі развітацца з інстытутам, сем атрымалі папярэджанні. У ліку гэтых сямі быў першакурснік Антон Барэйша, таварыш Грынявіцкага па Беластоцкай гімназіі.

Юбілейныя ўрачыстасці, што мелі ў сталіцы шырокі розгалас, праходзілі, калі Ігнат займаўся на чацвертым курсе. Вынікі навучальнага года засведчылі, што ў Грынявіцкім адбыўся нейкі пералом. Навучальны камітэт пазбавіў яго стыпендыі і пакінуў на тым самым курсе яшчэ на год.

Пастанова навучальнага камітэта датаваная канцом траўня. Праз месяц, 25 чэрвеня, у канцылярыі Тэхналагічнага інстытута быў зарэгістраваны

* *Жуковскйй-Жук И. И. Игнатий Иоакимович Гриневицкий. М., 1930. С. 12.*

* *Гэтыя падзеі цікава апісвае ў сваёй аповесці «Невядомы» Уладзімір Ліпскі.*

сакрэтны ліст ад пристава 2-га стана Быхаўскага павета Магілёускай туберні: «У давераны мне стан прыбыў дваранін Гарадзенскае губерні Ігнат Грынявіцкі, асоба даволі падазроная ў палітычнай надзейнасці. З рэляцыі папа Быхаўскага павятовага спраўніка ад 7 чэрвепя за № 68, я паведамлены, што Грынявіцкі слухач Санкт-Пецярбургскага Тэхналагічнага інстытута, а Грынявіцкі пра гэта нічога не заяўляе і пасведчання інстытута на адпачынак мне не прад'явіў.

З гэтае прычыны пакорна прашу канцылярыю інстытута паведаміць мне тэрмінова, адрасуючы адказ у мястэчка Прапойск, ці выдавалася інстытутам у гэтым годзе Грынявіцкаму пасведчанне для выезду яго на радзіму на час канікулаў. Калі не выдавалася, то чаму? Ці лічыцца ён студэнтам інстытута і, урэшце, усё тое, што вядома шстытуту аб паводзінах і палітычнай ненадзейнасці памянёнага Ігната Грыпявіцкага».

Адказ са сталіцы, відавочна, заспакоіў пільнага прыстава: «З нагоды рэляцыі ад 25 мінулага чэрвеня за № 27, кацылярыя Тэхналагічнага інстытута па даручэнні спадара Дырэктара гэтай установы мае гонар паведаміць Вам, ласкавы пане, што слухач Тэхналагічнага інстытута Ігнат Грынявіцкі адпачынку для выезду на радзіму з інстытута не браў, але з выпадку атрыманага ад яго інстытутам 2 ліпеня прашэння, дасланага ім з Гродзенскай губерні, яму адпраўлена адпускное пасведчанне ад 2 ліпеня 1879 года за № 754 тэрмінам да 31 жніўня гэтага года. З часу наступления Грынявіцкага ў інетытут у 1875 годзе, ён за ўвесь гэты тэрмін знаходжання ў інстытуце ні ў якіх заганных учынках начальствам інстытута заўважаны не быў, ніякіх такіх абставін, якія маглі б узбудзіць сумнеў, не было...»*

Ішоў 1879-ты. Год, які шмат у чым стау вырашальным для расейскага рэвалюцыйнага руху. Год, калі абраў свой шлях і Ігнат Грынявіцкі.

* *Абодва дакуметы цытуюцца па кнізе: Лінскі У. Невядомы: Аповесць пра Ігната Грынявіцкага. Мн., 1990. С. 197-198.*



# ВЫБАР ЗРОБЛЕНЫ

*Крывавае нецярпенне * Ігнат Грынявіцкі — нарадаволец * «Калі вы пойдзеце ў лес, я буду з ва--» * На нелегальным становішчы * Віленскі мешчанін Ельнікаў * «Рабочая газета» * Паплечнікі-землякі*

«Хаджэнне ў парод», якое скончылася разгромам, паставіла рэвалюцыянераў перад неабходнасцю пошукаў іншых формаў барацьбы. З рэштказ розных падпольных гурткоў ствараецца новая арганізацыя, што ў 1878 годзе атрымлівае назву «Зямля і воля». У яе ўваходзілі і прыхільнікі далейшай прапаганды сярод сялянства, і «лаўроўцы», і шматлікія паслядоўнікі Бакуніна, гатовыя неадкладна распачаць узброеную барацьбу з царскім урадам. Відавочна, не без іхнага ўплыву ў праграме арганізацыі была адзначана неабходнасць «сістэматычнага знішчэння найбольш шкодных або выдатных асобаў з урада», хоць гэта пакуль што разглядалася як сродак самаабароны.

Ідэйная стракатасць, сутыкненне супрацьлеглых поглядаў асуджалі «Зямлю і волю» на непазбежны і хуткі раскол.

Галоўным было пытанне пра тэрор.

Яно яшчэ абмяркоўвалася на сходах, але ўжо гучалі стрэлы тэрарыстаў, ужо гінулі вінаватыя і бязвінныя.

Студзень 1878-га. Вера Засуліч страляе ў оберпаліцмайстра генерала Ф. Трэпава.

У жніўні таго ж года Сяргей Краўчынскі забівае кінжалам шэфа жандараў М. Мезенцава.

«Тэарытычная абгрунтаванасць» палітычных забойстваў, захапленне, якое выказвала тэрарыстам частка расейскае публікі, неўтаймоўнае імкненне прыспешыць, падштурхнуць гісторыю — усё гэта павялічвала шэрагі безразважных герояў.

Люты 1879-га. Рыгор Гольдэнберг «праводзіць ліквідацыю» харкаўскага губернатара Д. Крапоткіна.

Праз месяц — замах на новага начальніка III аддзялення.

Дзеянне выклікае супрацьдзеянне.

З жніўня 1878 да жніўня 1879 года ў Расеі было пакарана смерцю 14 рэвалюцыянераў. Разгойдваўся крывавы маяткік тэрору і рэпрэсій.

Атмасферу, што панавала тады ў рэвалюцыйных колах, выдатна ўзнаўляе Юрый Трыфанаў у сваім рамане пра нарадавольцаў з вельмі дакладнаю назваю — «Нецярпенне».

Гэтае нецярпение штурхае на нечаканыя крокі нават такіх раззажлівых людзей, як прыхільнік цярплівай прапагандысцкай работы, вядомы ўдзельнік «хаджэння ў народ» Аляксандр Салаўёў. Ён просіць у кіраўніцтва «Зямлі і волі» дазволу здзейсніць ад імя арганізацыі замах на імператара Аляксандра II. Кіраўніцтва падполля адмаўляе Салаўёву, але некалькі рэвалюцыянераў дапамагаюць яму.

У часе замаху на Дварцовым пляцы тэрарыста напаткала няўдача, і 28 траўня 1879 года ён быў пакараны смерцю.

25 траўня таго самага года рашэннем навучальнага камітэта Грынявіцкага з прычыны непаспяховасці пакідаюць на паўторны курс. Кар'ера інжынера яго ўжо не вабіла.

Тым часам землявольцы — прыхільнікі тэрору таемна ствараюць фракцыю «Свабода або смерць». У шэрагах рэвалюцыянераў наспеў раскол.

У чэрвені 1879-га фракцыянеры правялі ў Ліпецку з'езд, які выпрацаваў новую праграму: ажыццявіць сацыялістычныя мэты руху магчыма толькі пасли таго, як будзе «зламаны дэспатызм»; галоўны сродак барацьбы за палітычныя змены ў імперыі — тэрор.

У жніўні 1879 года «Зямля і воля» раздзялілася на дзве новыя арганізацыі — «Народная воля» і «Чорны перадзел».

Праграмныя дакументы «Народнай волі» прадугледжвалі: замену царскай улады народным кіраваннем; скліканне Устаноўчага сходу; пераход зямлі ўва ўласнасць тых, хто яе ўрабляе; нацыяналізацыю прамысловых прадпрыемстваў; абвяшчэнне дэмакратычных свабодаў — слова, друку, сходаў, сумлення; агульнадаступную дармавую адукацыю і г.д.



Арганізацыя будавалася на аснове прынцыпу цэнтралізму. У ей было 80—90 мясцовых, 100—120 рабочых, 30—40 студэнцкіх, 20—25 гімназічных і прыкладна столькі ж афіцэрскіх гурткоў. Колькасць сяброў «Народнай волі» дасягала 500 чалавек, а з сімпатыкамі і распрапагандаванымі — 5 тысяч.

У беларускіх губернях працавалі прадстаўнікі Выканаўчага камітэта М. Грачэўскі, М. Рагачоў, М. Ашэнбрэнер, М. Аўчыннікаў, М.-Э. Янчэўскі і іншыя. Вайсковыя і вучнёўскія гурткі нарадавольцаў існавалі ў Менску, Гародні, Магілёве, Віцебску і Пінску. Пазней, на пачатку 1882 года, вайсковыя гурткі ўвойдуць у арганізацыю «Народнай волі» Віленскай вайсковай акругі, астатнія — у Паўночна-Заходнюю абласную нарадавольскую арганізацыю, што дзейнічала ў Менскай, Віленскай, Віцебскай, Гарадзенскай, Магілёўскай і Ковенскай губернях *.

Нарадавольцы запісалі ў сваёй праграме: «Тэрарыстычная дзейнасць, якая выяўляецца ў знішчэнні найбольш шкодных асобаў з урада, у абароне партыі ад шпігунства, у пакаранні за найбольш жорсткія выпадкі гвалту і самаўпраўства з боку ўрада, адміністрацыі і г. д., мае на мэце падарваць аўтарытэт урадавай сілы, цесупынна даваць доказы магчымасці барацьбы супроць'урада, падымаць такім чынам рэвалюцыйны дух народа і веру ў поспех справы і, нарэшце, фармаваць гатовыя да бою сілы»**. Сваёй бліжэйшаю мэтаю арганізацыя абвясціла падрыхтоўку народнага паўстання дзеля захопу ўлады. Рэвалюцыянеры лічылі, што ўмовы для гэтага створыць магутны ўдар тэрарыстаў, якія адначасова знішчаць дзесятак-паўтара стаўпоў самаўладдзя.

1879-ты — год уступлення ў «Народную волю»>

* *Беларус. Сав. Энцыклапедыя. Т. 7. Мн., 1973. С. 409.*

** *Революционное народничество 70-х гг. XIX в. Т. 2. М.; Л., 1965. С. 175.*

І. Грынявіцкага. Дакладная дата невядомая, але, на нашу думку, прыём адбыўся ўвосень, пасля приезду Ігната ў сталіцу з летніх інстытуцкіх вакацый.

«У 1879 г., — піша І. Жукоўскі-Жук,— Грынявіцкі далучаецца да гуртка, які з ініцыятывы кіеўскіх агітатараў меўся выправіцца «ў народ» з мэтаю арганізацыі рэвалюцыйных пасяленняў, што павінны былі стаць аперацыйным пунктам рэвалюцыі. План гэты... не ажыццявіўся, і гурток неўзабаве распаўся. Аднак гэта не ўгамавала Грынявіцкага: пасля гэтага ён выпраўляецца ў вёску арганізоўваць «баявыя дружыны». Якія былі поспехі Ігната Якімавіча на гэтай ніве... мы не ведаем. Але ўжо ўвосень 1879 года ён вярнуўся ў Пецярбург і заявіў таварышам, што такая дзейнасць у цяперашніх палітычных умовах зусім немагчымая і няплённая. У гэты момант ён, магчыма, прымірыўся б з якой-небудзь нядрэннай кастытуцыяй, якая давала б магчымасць дзейнасці ў народзе. Але ўжо хутка патрабаванні гэтыя яго не задавальнялі. Ён пачаў прыкметна схіляцца да больш радыкальных левых патрабаванняў і да больш крайніх метадаў рэвалюцыйнай барацьбы».

Таварышы прыгадвалі, што, стаўшы на шлях барацьбы з царызмам, Грынявіцкі не дзяліў справы на «вялікія» і «малыя». Ён удзельнічаў у рабоце старых гурткоў, арганізоўваў новыя, збіраў грошы на рэвалюцыйныя мэты і на дапамогу высланым, браў удзел у фабрыкацыі дакументаў, вёў ліставанне з іншымі гарадамі. Усякая поза была яму неўласцівая гэтаксама, як і любая праява нацыянальнай нецярпімасці або вузкага патрыятызму.

Ёсць звесткі, што ўдзельнікі польскіх рэвалюцыйных гурткоў у Пецярбурзе ўпарта глядзелі на Ігната, як на «свайго», паляка, і няраз кідалі яму папрокі ў здрадзе польскай справе. Яны лічылі, што, працуючы з расейцамі, ён кампраметуе іх палітычную свядомасць. «Калі вы пойдзеце ў лес, — нібыта пярэчыў ім Ігнат, — я буду з вамі, а цяпер, калі вы нічога не робіце, я буду працаваць дзеля вызвалення Расеі»*.

* *Жуковский-Жук И. Игнатий Иоакимович Гриневицкий. М., 1930. С. 13.*



Калі чытаеш пра ахвярнасць Грынявіцкага, прыгадваюцца словы, сказания на судзе флоцкім афіцэрам Мікалаем Суханавым, яшчэ адным нарадавольцам, які адмовіўся ад бліскучай кар'еры: «Я ніколі не стаў бы тэрарыстам, калі б самі ўмовы расейскага жыцця мяне да гэтага не змусілі. Найперш ненармальнае становішча народа, які цяжкімі паборамі давялі да самага жахлівага стану, фактычная недаступнасць для яго якой-небудзь адукацыі, бяспраўе слабых прывяло мяне да думкі, што далей так жыць немагчыма, што такі парадак рэчаў мусіць быць зменены... Я адчуваў, што няма чым дыхаць, што паветра няма. Я пачаў шукаць выйсце з такога становішча, пачаў шукаць шлях да барацьбы і, знайшоўшы, увесь аддаўся яму».

Увесь аддаўся рэвалюцыйнай дзейнасці і Грынявіцкі. Прынамсі, ні ўва ўспамінах ягоных сяброў па падполлі, ні ў судовых і паліцэйскіх дакументах няма нават намёку на нейкае іншае, асабістае жыццё.

Уступіўшы ў «Народную волю», ён напачатку выконваў розныя тэхнічныя даручэнні, але пераважна займаўся прапагандаю ў рабочым асяроддзі — выступаў на падпольных сходах, пашыраў нелегальную літаратуру.

30 траўня 1880 года Ігнат падае прашэнне, дзе паведамляе пра сваё нежаданне заставацца ў інстытуце і просіць выдаць дакументы. У атрыманым пасведчанні, між іншага, было запісана, што за час навучання Грынявіцкі «ні ў якіх нядобрых учынках з боку начальства не заўважаны». Новы агент «Народнай волі» быў добры канспіратар.

Перайшоўшы на нелегальнае становішча, ён стаў віленскім мешчанінам Мікалаем Сцяпанавічам Ельнікавым. Таварышы ведалі яго таксама як Коціка і Міхаіла Іванавіча.

У другой палове 1880 года ў сталіцы быў утвораны так званы цэнтральны гурток прапагандыстаў. Разам з А. Жалябавым, С Пяроўскай і некаторымі іншымі вядомымі нарадавольцамі ў ім працуе і Грынявіцкі. Кожны з гэтых рэвалюцыянераў стаяў на чале асобнай трупы добра падрыхтаваных рабочых прапагандыстаў. Ігнат кіраваў такой групаю на Выбаргскай старане. Сярод рабочых пашы-

раліся «Капітал» Маркса, творы Ласаля, нелегальныя брашуры «Сытыя і галодныя», «Хітрая механіка»...

Напрыканцы гэтага ж года на канспіратыўнай кватэры ў доме № 27 на Траецкім завулку* нарадавольцамі ствараецца падпольная друкарня, дзе пачынае выходзіць «Рабочая газета». Грыня'віцкі аддае ёй некалькі апошніх тыдняў свайго жыцця. Ен'быў не толькі аўтарам карэспандэнцый, але і наборшчыкам.

Першы нумар газеты выйшаў 15 снежня. Уверсе, у жалобнай рамцы, было змешчана паведамленне пра пакаранне смерцю рэвалюцыянераў Аляксандра Квяткоўскага і Андрэя Праснякова. «Няўжо мы будзем маўчаць перад сваімі катамі? — пыталася газета і адказвала: — Не! Іначай кроў гэтых пакутнікаў за народнае шчасце і волю ўпадзе на нашы галовы!»

У часе супрацоўніцтва ў «Рабочай газеце» Ігнат бліжэй сыходзіцца з падпольшчыкамі-землякамі.

Гаспадыняю кватэры, дзе друкавалася газета, была дачка мазырскага лесапрамыслоўца агент Выканкама «Народнай волі» Геся Гельфман, жыццё якой вартае рамана. Зусім дзяўчом яна ўцякла з роднага дому ў Кіеў. Пад уплывам ідэй Чарнышэўскага арганізоўвала швейныя майстэрні. Потым суд, высылка, ьяртанне да рэвалюцыйных спраў. Гесі належала сціплая, на першы погляд, роля, але гэта таксама было нподзённае рызыкаванне жыццём.

З рэкамендацыі Грынявіцкага наборшчыкам у нелегальную друкарню ўзялі Антона Барэйшу родам з-пад Пінска — добрага Ігнатавага знаёмага па вучэнні ў Беластоку.

Нярaз з'яўляўся на Траецкім завулку і сябар. Выканкама тэхнік Рыгор Ісаеў, сын магілёўскага паштара.

Адначасова з працаю ў «Рабочай газеце» і ў баявой дружыне, што ахоўвала нарадавольцаў ад шпегаў, Грынявіцкі ўвайшоў у групу назірання за царскімі выездамі, якою кіравала Пяроўская**.

* *Цяпер гэта дом № 25 па вуліцы Рубінштэйна.*

** *Дарэчы, з Магілёўшчыны, з сям'і беларускага шляхціча Весялоўскага паходзіла і маці Соф'і Пяроўскай Варвара Сцяпанаўна.*



# ПАЛЯВАННЕ НА ІМПЕРАТАРА

*Асоба Аляксандра II * Прысуд нарадавольцаў * Няўдалыя замахі * Праекты графа Лорыс-Мелікава * Сёмая спроба * Падкоп на Малой Садовай * Чацвёра з 47 * Развітанне з радзімай * Кватэра на Сімбірскай вуліцы*

На думку шмат каго з сучаснікаў, Аляксандр II быў непадобны да бацькі — самаўпэўненага салдафона Мікалая I.

Сярод выхавальнікаў будучага імператара значную ролю адыграў вядомы паэт Васіль Жукоўскі. Жонка, гесен-дармштадская прынцэса Максімліяна Вільгельміна Аўгуста Сафія Марыя, якая ў праваслаўі ўзяла сабе імя Марыя Аляксандраўна, нарадзіла цару восем дзяцей. Яго ўлюбёным пісьменнікам быў Тургенеў; казалі, што над «Запіскамі паляўнічага» Аляксандр не мог стрымаць слсз. Дэталь да партрэта: цар не любіў чытаць друкаваны тэкст, і кнігі, што прыцягвалі ягоную ўвагу, тэрмінова — часам за адну ноч — павінны былі перапісаць найлепшыя расейскія пісары-каліграфы.

Аляксандр каранаваўся ўжо ў сталым узросце, у часе Крымскай вайны, якая скончылася для імперыі ганебнай паразай. Разумеючы катастрафічны стан краіны, яе ўсё большае адставанне ад еўрапейскіх дзяржаў, новы імператар пайшоў на важныя эканамічныя, сацыяльныя і палітычныя рэформы, якія, на жаль, не атрымалі належнага працягу і глыбіні. Прагрэсіўныя пачынанні нярэдка перакрэсліваліся контррэформамі, прыхільнікі пераменаў з ліку высокіх дзяржаўных асобаў рабіліся ахвярамі прыдворных падкопаў.

Вядомы лавелас, Аляксандр II тым не менш быў здольны і на доўгае глыбокае пачуццё, у якое перарасла ягоная сувязь з княгіняю Кацярынай

Далгарукай. Ад яе цар таксама меў дзяцей, якіх вельмі любіў. Па смерці імператрыцы ён узяў з княгіняю Далгарукай (замужам — Юр'еўская) маргапатычны шлюб. Дзеці ад такога шлюбу не мелі ніякіх правоў на трон, але ўчынак цара канчаткова сапсаваў ягоныя адносіны са старэйшым сыпам — спадкаемцам расейскага трона.

Блізкія да Аляксандра II людзі сцвярджалі, што асабістая драма цяжка дзейнічала на яго і часта з'яўлялася ўражанне, нібыта імператар.ужо не хоча займацца дзяржаўнымі справамі, а з задавальненнем абмежаваўся б падарожжамі, паляваннем і вузкім колам сяброў.

Аўтар згаданага рамана «Вытокі» Марк Алданаў словамі аднаго са сваіх герояў характарызуе цара наступным чынам: «Гэты чалавек вызваліў сялянаў, увёў земства, самакіраванне, цудоўны суд замест дрэннага старога, скасаваў рэкрутчыну і цялесныя пакаранні, без сораму выбавіў нас з праíгранае вайны... замірыў Каўказ... мірна, не праліўшы ніводнае кроплі крыві, далучыў да Расіі найбагацейшыя землі Далёкага Усходу... Хіба я не маю права сказаць, што ён зрабіў болей за Пятра? І хіба ён не меў сусветнае славы, накшталт славы Лінкольна?.. І мне незразумела, што ж такое адбылося з царом... Чаму чалавек, які быў найвялікшым рэфарматарам, больш нічога не хоча рабіць?.. З якой прычыны... гэты бясспрэчна добры і разумпы чалавек акружыў сябе рэтраградамі?..» У адукаваных колах тагачаснага расейскага грамадства такія погляды на асобу Аляксандра II былі даволі тыповыя.

Цікава, што пасля замаху Дз. Каракозава, кангрэс Злучаных Штатаў Амерыкі накіраваў у Пецярбург адмысловую дэлегацыю, каб вітаць імператара, «розуму і сэрцу якога расейскі народ абавязаны свабодаю». (Ці не наводзіць гэты факт на некаторыя паралелі з сучаснасцю, калі за мяжою кіраўнік дзяржавы можа мець аўтарытэт непараўнана вышэйшы, чым у сваіх грамадзянаў?)

Што да нарадавольцаў, дык яны лічылі цара непасрэдна вінаватым у смерці іхных паплечнікаў. Менавіта ён увасабляў для іх усё зло расейскага самаўладдзя, хоць, па сутнасці, краінаю ад імя цара



Ігнат Грынявіцкі ў юнацтве



Куток старога Беластока. Здымак пачатку XX стагоддзя



Рынкавая вуліца ў Беластоку. Па ёй хадзіў Ігнат Грынявіцкі, калі вучыўся ў Беластоцкай рэальнай гімназіі. Тут ён марыў пра інстытут і кар'еру інжынера або навукоўца. Тут сустракаў былых паўстанцаў 1863 года, чуў ад старых месцічаў пра таемнае рэвалюцыйнае таварыства «Вайсковыя сябры», удзельнікі якога ў снежні 1825 года сарвалі прысягу Мікалаю I у раскватараваных вакол горада палках

KAMUNIKAT.org



Так выглядаў Санкт-Пецярбургскі Тэхналагічны інстытут у часе навучання там Ігната Грынявіцкага. Гэта была адна з самых прэстыжных навучальных устаноў Расейскай імперыі. Тут рыхтавалі высакакласных інжынераў, тэхнічных кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў. Дыплом Тэхналагічнага інстытута гарантаваў выпускніку забяспечанае жыццё і адкрываў выдатныя перспектывы ўзыходжання па службовай лесвіцы



Его Превосходительству
Господину Директору С.Петербургского Технологического Института

Студента IV курса
Игнатия Гриневицкого

Прошение

Не имея в виду оставаться в Институте, честь имею просить Ваше Превосходительство выдать мне мои документы, а также и свидетельство с пребывании в Институте.

Игнатий Гриневицкий

30 Мая 1880 года

Заява І. Грынявіцкага дырэктару ў сувязі з намерам пакінуць інстытут

KAMUNIKAT



1 сакавіка 1881 года. Выбух бомбы Ігната Грынявіцкага на набярэжнай Кацярынінскага канала ў Пецярбурзе.
З тагачаснае гравюры



На месцы замаху праз чвэрць гадзіны. Ахвярамі дзеянняў нарадавольцаў у гэты дзень, апрача імператара і самога тэрарыста, стаў казак з царскай аховы і двое выпадковых прахожых: хлопчык з мясной крамы і жанчына-салдатка. Шэсць чалавек атрымалі цяжкія раны, адзінаццаць — лёгкія. Некаторыя страцілі зрок, слых, засталіся калекамі

KAMUNIKAT.org



Міністр унутраных спраў граф М. Т. Лорыс-Мелікаў, які прапанаваў праект дзяржаўнай рэформы, каб вывесці імперыю з крызісу. У дзень сьаёй смерці цар падпісаў дакумент аб зацвярджанні праекта саветам міністраў



Мікалай Кібальчыч



Геся Гельфман



Андрэй Жалябаў



Соф'я Пяроўская

KAMUNIKAT.org





1 сакавіка 1881 года. Карэта Імператара Аляксандра II пасля выбуху першай бомбы, кінутай Мікалаем Рысаковым. Зтагачаснае гравюры.

Імператар Аляксандр II на смяротным ложы. Дваццаціпяцігадовае валадаранне цара-«вызваліцеля» скончылася.
З тагачаснае гравюры.

KAMUNIKAT.org



ПРАВИТЕЛЬСТВУЮЩАГО СЕНАТА

515 ОСОБАГО ПРИСУТСТВІЯ

ДЛЯ СУЖДЕНІЯ ДѢЛЪ О ГОСУДАРСТВЕННЫХЪ ПРЕСТУПЛЕНІЯХЪ

ДѢЛО

о мѣщанинѣ Николаѣ Рысаковѣ, крестьянахъ Андреѣ Желябовѣ, Тимофеѣ Михайловѣ, сынѣ священника Николаѣ Кибальчичѣ, дворянкѣ Софьѣ Перовской и мѣщанкѣ Гесѣ Гельфманъ обвиняемыхъ въ совершеніи 1го Марта 1881 года злодѣянія жертвою коего палъ въ Бозѣ почившій Государь Императоръ Александръ Николаевичъ

Томъ 1й

№ 44

поступило 7 Марта

рѣшено 29 Марта года

Судовая справа ўдзельнікаў забойства Аляксандра II



ГОМОН

Бѣлорусское соціально-революціонное обозрѣніе

№ 1

Содержанія

От редакціи.
Роль мѣстных революц. групп.
Воззваніе к Бѣлорус. интеллиг.
Воззваніе конституціоналистов.
Общество „освобожд. труда“

Корреспонденція из Вильны
" " " Петербурга.
" " " Кіева.
" " " Витебска.
" " " Харькова.

- 1884 -

Першы нумар падпольнага гектаграфічнага часопіса «Гомон», які ў 1884 годзе пачала выдаваць у Пецярбурзе беларуская фракцыя «Народнай волі». На яго старонках з рэвалюцыйна-дэмакратычных пазіцый гаварылася пра існаванне беларускай нацыі і гучала пагрэбаванне яе федэратыўнай самастойнасці пасля знішчэння царызму. Ігната Грынявіцкага «гоманаўцы» называлі адным з гарачых заснавальнікаў сваёй фракцыі




Вокладка кнігі І. І. Жукоўскага-Жука пра Ігната Грынявіцкага, выдадзеная Таварыствам палітычных катаржанаў у 1930 годзе



Паштоўка «Vialikija Dziejačy Biełaruskaha Adradžeńnia» (выдадзена ў Нямеччыне ў 1948 годзе). І. Грынявіцкі паказаны тут сярод дзеячаў беларускага наныянальна-вызваленчага руху К. Каліноўскага, Ф. Багушэвіча, П. Крычэўскага і В. Захаркі

KAMUNIKAT.org



Мост Грынявіцкага ў Пецярбурзе. Апошнія тыдні перад смерцю герой «Народнай волі» жыў пад чужым імем на Выбаргскай старане, у доме № 59 па Сімбірскай вуліцы

кіраваў вялізны феадальна-бюракратычны апарат.

І. Грынявіцкі разам з іншымі рэвалюцыянерамі з Беларусі мог выстаўляць імператару і свой рахунак: задушэнне паўстання 1863 года, дзесяткі пакараных смерцю і тысячы асуджаных на зняволенне і выгнанне паўстанцаў, забарона беларускага друкаванага слова, ліквідацыя апошняй у беларускіх губернях вышэйшай навучальнай установы — Горы-Горацкага земляробчага інстытута...

На Беларусі добра памяталі і ўступленне Аляксандра II на царства. Падпісаным адразу пасля каранацыі маніфестам цар дакляраваў тры наступныя гады не праводзіць рэкруцкіх набораў, і адразу ж выдаў загад узяць у паўночна-заходніх беларускіх і літоўскіх губернях 360 тысяч рэкрутаў.

Смяротны прысуд цару Выканаўчы камітэт «Народнай волі» зацвердзіў адразу пасля яе стварэння, у жніўні 1879 года. Падрыхтоўцы забойства былі аддадзеныя амаль усе матэрыяльныя і людскія сілы арганізацыі.

Спачатку Выканкам вырашыў, што найменш надзейна імператарава ахова дзейнічае на шляху, па якім Аляксандр II штогод ездзіў адпачываць у Крым і вяртаўся назад. Але на чыгунцы тэрарыстаў напаткаў шэраг няўдач. 19 лістапада 1879 года прагучаў магутны выбух пад горадам Аляксандраўскам, аднак пад адхон пайшоў не царскі цягнік, а цягнік з прыдворнымі. Былі забітыя і параненыя, пакалечаныя.

Улады адказалі масавымі арыштамі, а карадавольцы — новымі спробамі выканаць свой прысуд.

У сталярную майстэрню Зімовага палаца ўладкаваўся на працу Сцяпан Халтурын. 5 лютага 1880-года ён узарваў пад царскай страўняй магутны дынамітавы зарад. Выбуховая хваля прабіла два паверхі, але цар з сям'ёю і гасцямі — прынцам Гесенскім з сынам на колькі хвілін затрымаліся на абед. і засталіся жывыя. Ахова, рабочыя і слугі ў разлік не прымаліся.

Няўдачаю скончылася і мініраванне Каменнага моста, праз які імператар вяртаўся ў сталіцу з Царскага Сяла.

Забойства Аляксандра II ператварылася для рэвалюцыянераў у самамэту, у справу асабіста-

га гонару, урэшце, у паляванпе на чалавека.

Рабіліся спробы фізічнай расправы і з высока-пастаўленымі дзяржаўнымі асобамі.

20 лютага 1880 года дваццаціпяцігадовы слуцкі ўраджэнец Іпаліт Младзецкі страляў у галоўнага начальніка Вярхоўнай распарадчай камісіі М. Лорыс-Мелікава, які атрымаў ад цара, па сутнасці, дыктатарскія паўнамоцтвы. Ужо праз два дні пасля свайго няўдалага замаху тэрарыст быў павешаны на Сямёнаўскім пляцы.

Вядома, што Младзецкага спрабаваў уратаваць ад смерці пісьменнік Усевалад Гаршып, аднак Лорыс-Мелікаў адхіліў ягоную просьбу. Перажытая ў выніку роспач выклікала ў Гаршына цяжкую душэўную хваробу, якая праз восем гадоў у часе аднаго з прыпадкаў спрычынілася да самагубства.

Тым часам у руках паліцыі апынуліся сябры Выканкама «Народнай волі» Мікалай Марозаў, Арон Зундзялевіч, Айзік Арончык, Аляксандр Баранцікаў, Аляксандр Міхайлаў...

Але разам з арыштамі ўлады спрабавалі знайсці іншыя шляхі пераадолення крызісу.

Граф Лорыс-Мелікаў, які ўжо займаў пасаду міністра ўнутраных спраў, у канцы 1880 года падрыхтаваў цару адмысловы даклад з прапановаю «завяршыць вялікую справу дзяржаўных рэформаў», бо задача выхаду імперыі з крызісу «не можа быць выканана толькі карнымі і паліцэйскімі захадамі». Яшчэ раней была крыху аслаблена цэнзура, скасавана адыёзнае III аддзяленне*.

Лорыс-Мелікаў меркаваў прыцягнуць да падрыхтоўкі сваіх заканапраектаў даволі шырокае кола новых энергічных людзей. Цар сустрэў праект міністра досыць прыхільна. Узнікла магчымасць руху Расейскае імперыі да канстытуцыі.

Між тым «Народная воля» рыхтавалася да сёмай спробы царазабойства.

Група назірання, куды ўваходзіў Грынявіцкі, з канца лістапада 1880 года па што тыдзень карпатліва вывучала пецярбургскія маршруты царскага экіпажа. Назіральнікі дзейнічалі па двое, пары з мэтаю канспірацыі штодня чаргаваліся.

Тэрарыстам стала вядома, што кожную нядзелю Аляксандр II нрысутнічаў на ўрачыстым разводзе варты ў Міхайлаўскім манежы, адкуль заязджаў у палац да вялікай кнігіні Кацярыпы Міхайлаўны, потым ехаў палуднаваць да спадкаемца трона і вяртаўся ў Зімовы палац. Найчасцей царская карэта з аховаю рухалася па Малой Садовай вуліцы або па набярэжнай Кацярынінскага канала.

У снежні 1880 года нарадавольцы нанялі на рагу Неўскага праспекта і Малой Садовай памяшканне і, адчыніўшы там краму па гандлі сырам, пачалі падкоп. Напрыканцы лютага ёп быў гатовы, заставалася адно закласці міну з двух пудоў чорнага дынаміту. Пасля выбуху, паводле разлікаў тэрарыстаў, павінпа была ўтварыцца велізарная варонка. Пазней, па судзе, галоўны тэхнік арганізацыі М. Кібальчыч скажа: «Вядома, ўсё, што знаходзілася б над варонкаю, гэта значыць, экіпаж з царом і канвой, загінулі б, але не больш».

Аўтары даследаванняў пра дзейнасць «Народнай волі» звычайна абыходзілі маўчаннем той факт, што вельмі часта ў выніку тэрарыстычных актаў гінула, атрымлівала цяжкія раненні і кантузіі шмат старонніх, ні ў чым не вінаватых людзей. Менавіта ў тыя часіны закладваліся асновы той, «самаіі перадавой» сістэмы поглядаў, у якой чалавеку адводзіцца роля шрубкі, а чалавечае жыццё не мае ніякае вартасці, асабліва калі гэтае жыццё адбіраюць дзеля псрамогі «светлай будучыні».

Распрацаваны Выканаўчым камітэтам план прадугледж'ваў, што ў выпадку няўдачы на Малой Садовай імператар будзе забіты бомбавым выбухам, калі ж і гэта не атрымаецца, забіць Аляксандра II кінжалам, скарыстаўшыся з непазбежнай мітусні і разгубленасці аховы, узяўся А. Жалябаў. Ён жа амаль з пяцідзесяці рэвалюцыянераў, згодных ахвяраваць жыццём, выбраў чатырох.

Гэта былі рабочыя Цімафей Міхай.паў і Інан Емяльянаў, былыя студэнты Мікалай Рысакоў і Ігнат Грьгнявіцкі.

У тым часе, у студзені-лютым 1881 года, Ігнат

* *Даводзіцца сустракацца з думкаю, што ў III аддзяленні быў велізарны штат, які можна параўнаць хіба з рэпрэсіўнаю машынай НКВД 30-х гадоў. У сапраўднасці на момант ліквідацыі яно мела 72 штатныя і вольнанаёмныя супрацоўнікі.*

здолеў на кароткі час вырвацца з Пецярбурга, каб наведаць Вялікія Грынявічы. Ён ехаў развітацца з сям'ёю, з радзімаю. У бацькоўскім доме пражыў тры дні. Свой раптоўны прыезд растлумачыў «справамі». Прыехаў у добрым гуморы, вясёлы і ласкавы — такі, якім яго ведалі з дзяцінства. Сястра Юлія прыгадвала сваю сустрэчу з Ігнатам так: «Ён быў у дыхтоўным гарнітуры, які шчыгульна аблягаў ягоную стройную, вышэй сярэдняга росту постаць. Недаўгія цёмна-русыя кучаравыя спераду валасы, мяккая бародка і вусы абрамоўвалі твар з глыбокімі ўдумлівымі вачыма. З ім была акуратна напакаваная дарожная валіза...

— Хто табе так акуратна склаў рэчы ў валізку?.. Відаць, нейкая паненка?

— Але, паненка... У мяне шмат добрых паненак ёсць,— жартам адказаў ён»*.

Ігнат наведаў магілу маці, якая памерла за колькі месяцаў перад тым. Ён гуляў па ваколіцах маёнтка, чытаў, слухаў бацькаву скрыпку, спакойна і дасціпна гутарыў з сямейнікамі.

Для блізкіх ён па-ранейшаму заставаўся пецярбургскім студэнтам, гонарам і надзеяю роду Грынявіцкіх. У свеце, дзе ён, паводле ўяўленняў сям'і, жыў, былі лекцыі знакамітых прафесараў, сталічныя тэатры, бібліятэкі і музеі. У тым свеце не было месца нелегальным друкарням, арыштам, пакаранням смерцю на досвітку. Ніхто з родных, вядома, не думаў, што бачыць Ігната апошні раз. Ён не выдаў сябе ніводным неасцярожным словам або рухам.

Вярнуўшыся ў Пецярбург, а магчыма, яшчэ напярэдадні паездкі на радзіму, ён пад імем Мікалая Ельнікава наняў пакой на Выбаргскай старане, у доме № 59 на Сімбірскай вуліцы.

Гаспадыня кватэры № 22, дзе пасяліўся Грынявіцкі, ураднікава дачка Ганна Артамонава і яе прыслуга салдацкая ўдава Акуліна Смялкова на судовым працэсе царазабойцаў апавядалі пра ціхае і самотнае жыццё кватаранта, пра ягоную беднасць і сціпласць.

* *Жуковский-Жук И. И. Игнатий Иоакимович Гриневицкий. М., 1930. С. 24.*



Калі гаспадыня пацікавілася, чым ён зарабляе на жыццё, Ігнат адказаў, што займаецца пісьмовай работаю ў канторы. У ягоным пакоі былі толькі самыя неабходныя рэчы, адсутнічаў нават намёк на нейкую ўтульнасць.

На пытанне суддзі, хто з дзяржаўных злачынцаў наведваў Ельнікава, прыслуга Смялкова паказала на Мікалая Рысакова, Андрэя Жалябава, Соф'ю Пяроўскую і Гесю Гельфман.

Грынявіцкі звычайна выходзіў з дому а 10-й гадзіне раніцы, а вяртаўся аб 11-й вечара. Апрача сачэння за царом, у гэтым часе ён слухаў лекцыі М. Кібальчыча пра механізм і сілу выбуховых прыстасаў, удзельнічаў у іх выпрабаваннях.

Лекцыі чыталіся на новай канспіратыўнай кватэры у доме № 5 на вуліцы Цялежнай. Там адбылося і асабістае знаёмства чатырох бомбакідальнікаў. Гаспадыняю кватэры была Геся Гельфман.

Рэвалюцыянеры спяшаліся. У рукі паліцыі ўжо трапілі людзі, што ведалі пра падрыхтоўку забойства імператара. Нягледзячы на ўсе засцярогі, па сталіцы лёталі чуткі пра зроблены тэрарыстамі падкоп.

# ПЯРЭДАДЗЕНЬ

*Арышт Жалябава * Выпрабаванні выбуховых прыстасаў * Надзвычайнае пасджэнне Выканкама * Запавет Грынявіцкага * «Раскошнае дрэва свабоды еымагае ахвяраў»*

Адно з апошніх пасяджэнняў змоўшчыкаў адбылося ў Грынявіцкага на Сімбірскай. 26 лютага ўвечары Жалябаў, Пяроўская і кідальнікі бомбаў яшчэ раз падрабязна абмяркоўвалі план будучай акцыі.

Падзеі разгортваліся надзвычай імкліва.

27 лютага паліцыя ўзяла Андрэя Жалябава. Зробленая ў ягонай кватэры засада павінна была затрымліваць любога наведніка. Паведамляючы пра арышт аднаго з галоўных рэвалюцыянераў імператару, усцешаны Лорыс-Мелікаў пісаў: «Назіранне за астатнімі асобамі доўжыцца і можна спадзявацца, што арышты будуць працягвацца».

У дзень арышту Жалябава Ігнат сустрэўся ў рэстарацыі з Рысаковым, Міхайлавым і Емяльянавым. Яны дамовіліся пра заўтрашнюю паездку ў пецярбургскія ваколіцы на выпрабаванне бомбы. Увечары Грынявіцкі не прыйшоў дахаты. Магчыма, у гэтую ноч ён быў на Малой Садовай, дзе закончвалася апошняя падрыхтоўка ў падкопе пад вулічным брукам.

28 лютага М. Кібальчыч і кідальнікі бомбаў выпрабоўваюць за Смольным манастыром выбуховы прыстас.

Высветлілася, што бомба са смяротным змесцівам — серная кіслата, сумесь берталетавай солі з цукрам, грымучы міркіль і г. д.— дзейнічае на 15 сажняў*.

* *Блізу 32 метраў (1 сажань роўны 2,13 метра).*



Пра арышт кіраўніка акцыі тэрарысты яшчэ не ведалі.

Таго ж дня ўлады робяць агляд у краме на Малой Садовай. Рэвалюцыянерам пашанцавала, але адтэрміноўваць аперацыю яны ўжо не маглі.

На сваім надзвычайным пасяджэнні Выканаўчы камітэт «Народнай волі» прызначае замах на 1 сакавіка. Кіраўніцтва тэрарыстамі бярэ па сябе Соф'я Пяроўская.

Рыгор Ісаеў атрымаў задание ўначы закласці ў падкоп міну. Мікалай Кібальчыч, Мікалай Суханаў і Міхаіл Грачэўскі за адну ноч зрабілі чатыры бомбы.

Грынявіцкі вярнуўся дахаты ўвечары.

Ноч на 1 сакавіка 1881 года была ў ягоным жыцці апошняя.

Магчыма, якраз тады, прадчуваючы хуткую гібель, ён і напісаў свой звернуты да паплечнікаў, таварышаў па барацьбе запавет:

«Аляксандр II павінеп памерці. Дні ягоныя злічаныя.

Недалекая будучыня пакажа: мне або іншаму давядзецца зрабіць апошпі ўдар, водгулле якога разнясецца па ўсей Расеі і адгукнецца ў самых далёкіх яе кутках.

Ён памрэ, а разам з ім памрэм і мы, яго ворагі, яго забойцы.

Гэта неабходна дзеля свабоды, бо ў выніку значна пахіснецца тое, што хітрыя людзі называюць кіраваннем — манархічным, неабмежаваным, а мы — дэспатызмам...

Што будзе далей?

Ці шмат яшчэ ахвяраў запатрабуе нашая няшчасная, але дарагая радзіма ад сваіх сыноў дзеля свайго вызвалення? Я баюся... мяне, асуджанага на смерць, чалавека, які адной нагой у трупе, палохае думка, што наперадзе барацьба, якая забярэ яшчэ шмат дарагіх ахвяраў, а яшчэ болей — апошняя смяротная бітва з дэспатызмам, якая, я перакананы, ужо не вельмі далёка і якая залье крывёю палі і нівы нашае радзімы, бо — на жаль! — гісторыя паказвае, што раскошнае дрэва свабоды вымагае чалавечых ахвяраў.

Я не буду ўдзельнічаць у апошняй барацьбе. Лёс

асудзіў мяне на раннюю гібель, і я не ўбачу перамогі, не буду жыць ні дня, ні гадзіны ў тым светлым часе, але лічу, што сваёй смерцю зраблю ўсё, што павінны быў зрабіць, і большага ад мяне ніхто, ніхто на свеце патрабаваць не можа.

Задача рэвалюцыйнай партыі — запаліць ужо назапашаны гаручы магэрыял, кінуць іскру ў порах і потым зрабіць усё дзеля таго, каб пачаты рух скончыўся перамогаю, а не татальным вынішчэннем найлепшых людзей краіны»*.

* *Завещание И. И. Гриневицкого // «Народная воля» в документах и воспоминаниях. М., 1930. С. 249—250.*

# 1 САКАВІКА 1881 ГОДА

*Сустрэча на Цялежнай * Даклад міністра ўнутраных спраў * Імператар мяняе маршрут * Выбухі на Кацярынінскім канале * Смерць імператара * Апошнія гадзіны Грынявіцкага * Нявінныя ахвяры.*

Тае раніцы Ігнат Грынявіцкі падняўся раней, чым звычайна. Ён спяшаўся на Цялежную, дзе а восьмай гадзіне на кватэры ў Гесі Гельфман збіраліся тэрарысты.*

Прыкладна праз гадзіну туды прыйшла Соф'я Пяроўская, якая паведаміла пра арышт Жалябава. У яе ў клунку ляжалі дзве бомбы, яшчэ дзве прынёс Кібальчыч. Гэта былі бляшанкі цыліндрычнай формы вагою 5—6 фунтаў. Запасных прыстасаў для абароны і на выпадак няўдачы тэрарысты не мелі. Кідаць прыстас трэба было не болей чым з пяці крокаў.

Узяўшы аловак, Пяроўская накрэсліла на канверце план маршрута, па якім мусіў ехаць цар, і растлумачыла кожнаму з чатырох бомбакідальнікаў ягоную ролю. Яна сказала, што на Малой Садовай цара ўжо чакаюць. Пра падкоп ведалі не ўсе прысутныя.

Апоўдні тэрарысты з бомбамі былі на сваіх месцах. М. Рысакоў і І. Емяльянаў занялі пазіцыі ля помніка Кацярыне II і на рагу Неўскага і Малой Садовай. І. Грынявіцкага як найбольш вытрыманага і надзейнага С. Пяроўская паставіла разам з Ц. Міхайлавым у канцы вуліцы, пад якой у пад-

* *Падзеі гэтага дня аўтар узнаўляе па кнігах: Революционный период русской истории (1861—1881 гг.). Ч. 2. СПб., 1913; Хроника социалистического движения в России. 1878—1887: Официальный отчет. М., 1906; 1 марта 1881 года. Казнь императора Александра II: Документы и воспоминания. Л., 1991.*

копе ляжала два пуды дынаміту. У тым выпадку, калі міна не спрацуе, ініцыятыву павінны быў браць на сябе Ігнат. Пяроўская падавала сігналы насоўкаю.

Імператар у апошні дзень свайго жыцця ўстаў на пачатку дзевятай гадзіны. Вядома, што ён доўга гуляў па Зімовым палацы з княгіняй Юр'еўскай і з дзецьмі, катаўся са сваім улюбёнцам-сынам на горках у адной з залаў. Пасля малітвы ў палацавай царкве ён снедаў з прыдворнымі і ўразіў усіх вясёлым настроем.

Яшчэ да снядання Аляксандр II выправіў прыдворнага скарахода да хворага графа Лорыс-Мелікава. Цар меўся ехаць да міністра, але неўзабаве той з'явіўся сам.

Прыкладна тым часам, калі тэрарысты займалі свае месцы, імператар выслухаў даклад Лорыс-Мелікава і падпісаў дакумент пра дзяржаўную рэформу. Паводле яе для разгляду новых законапраектаў ствараласся камісія з прадстаўнікоў гарадоў і земстваў. Прадугледжвалася, што асобы з ліку выбарных дэпутатаў, якія выявяць «асаблівыя веды і выдатныя здольнасці», будуць запрошаны ў Дзяржаўны савет. 4 сакавіка праект выносіўся на зацверджанне саветам мініс.раў.

З даклада цар даведаўся пра агляд падазронай крамы на Малой Садовай. Міністр сказаў, што чуткі пра падкоп не спраўдзіліся, трывога была дарэмная.

Пасля даклада Аляксандр II збіраўся ехаць у Міхайлаўскі манеж на развод лейб-гвардзейскага Ізмайлаўскага палка. Жонка, княгіня Юр'еўская, і Лорыс-Мелікаў адгаворвалі цара, але той адказаў, што ён у сваёй сталіцы, а не ў вотчыне рэвалюцыянераў.

Карэта і канвой чакалі ў прыбудаванай да царскага пад'езда дзеля бяспекі доўгай галерэі. Цароў фурман умеў з месца пускаць коней рыссю. Загадаўшы на выездзе з галерэі кіравацца ў манеж не па Малой Садовай (відаць, паведамленне міністра ўнутраных спраў наконт падкопу ўсё ж насцярожыла Аляксандра II, а па набярэжнай Кацярынінскага канала, імпегатар істотна зблытаў планы рэвалюцыянераў.

Узмахам хусцінкі Пяроўская апавясціла тэрарыстаў, што ўступае ў сілу запасны варыянт і ім трэба ісці на Кяцярынінскі канал*. Перад гэтым Пяроўская, Грынявіцкі і Рысакоў сустрэліся ў кандытарскай Андрэева, што месцілася на Неўскім праспекце ў падвальным паверсе насупроць Гасцінага двара. Ігнаг, адзіны сярод таварышаў, здолеў з'есці замоўленую порцыю.

Імператар прымаў развод гвардзейскага сапёрнага батальёна. Калі верыць відавочцам, у той дзень ён — у мундзіры таго ж батальёна — быў асабліва вясёлы і прыгожы.

Тэрарысты на адлегласці трыццаці крокаў адзін ад аднаго занялі новыя пазіцыі на набярэжнай. З другога берага канала, перайшоўшы яго па Казанскім мосце, за імі напружана сачыла Пяроўская.

Першы з таго боку, адкуль чакалі царскі экіпаж, стаяў Рысакоў, другі — Грынявіцкі, далей — Емяльянаў. Чацверты, Цімафей Міхайлаў, чалавек вялікай асабістай мужнасці (ён засведчыць гэта сваімі паводзінамі на судзе і на эшафоце), у той дзень не вытрымаў і, пакінуўшы сваё месца, пайшоў дадому.

Заехаўшы пасля разводу ў манежы да вялікай княгіні Кацярыны Міхайлаўны ў Міхайлаўскі палац, імператар па Інжынернай вуліцы накіраваўся на Кацярынінскі канал. На беразе царская запрэжка пайшла буйной рыссю, і казакі з эскорту пусцілі коней наўскач. Каля паловы на трэцюю экіпаж параўняўся з чалавекам у дэмісезонным паліто з тоўстага драпу.

Гэта быў Рысакоў. Ён кінуў загорнутую ў сурвэтку бомбу (па ўспамінах сведкаў, яна была падобная да снежнага камяка) услед карэце.

Выбух нагадваў залп некалькіх гарматаў. Трое казакоў упалі з коней. Зазвінела шкло з разбітых выбуховаю хваляю вокнаў палацавай стайні на другім баку канала. Адусюль свісталі гарадавыя і збягаліся людзі.

Праз колькі імгненняў дым развеяўся. Стагналі, лежачы на бруку, параненыя з ліку царскіх ахоўнікаў і выпадковых прахожых. Сам імператар быў жывы і цэлы. «Ці схоплены злачынец?» — пацікa-

* *Цяпер канал імя Грыбаедава.*

віўся ён, выходзячы з пашчапанага выбухам экіпажа.

Паліцмайстар Дваржыцкі ўгаворваў Аляксандра II хутчэй ехаць у Зімовы палац, але той захацеў агледзець месца выбуху. Потым ён падышоў да збітага з ног і абяззброенага Рысакова, якога трымалі дзесяткі два рук. «Гэты? — нахіліўся да тэрарыста Аляксандр II.— А ён вельмі прыгожы».

У імператара запыталіся, ці не паранены ён.

«Дзякуй Богу, я ацалеў».

«Яшчэ невядома, ці дзякуй Богу»,— злавесна прамовіў Рысакоў.

Да імператара ішоў Ігнат Грынявіцкі. Наблізіўшыся амаль усутыч (паводле сведкаў, на адлегласць не болей за два аршыны, або 1,5 метра), ён ускінуў рукі з бомбаю над галавой...

Гэты выбух, што прагучаў праз 4—5 хвіліп пасля першага, чамусьці атрымаўся мацнейшы. Хвіліны дзве нічога не было відаць, толькі чуліся крыкі новых ахвяраў. Потым вачам адкрылася страшнае відовішча.

Аляксандр II і ягоны забойца амаль поруч сядзелі на снезе, прыхіліўшыся плячыма да парэнчаў над каналам*. Вакол, сярод параненых, ляжалі рэшткі адзення, адарваныя эпалеты, зброя, шматкі чалавечых целаў. Ёсць сведчанні, што трэці тэрарыст, Емяльянаў, схаваўшы бомбу, спрабаваў дапамагчы цару.

Смяротна параненага імператара павезлі ў Зімовы палац. Шматтысячны людскі натоўп хутка ўбачыў, як цароў штандар паўзе долу.

Дваццаціпяцігадовае царства Аляксандра II скончылася.

Гэтым часам у прыдворным Канюшаным шпіталі пакутліва канаў царазабойца.

Медычны акт сведчыць: «Дастаўлены ў поўным непрытомным стане... На лобе і на твары шмат крывавых ранак, абодва павекі пабітыя з кровазліццём пад злучальную абалонку... правае вока неадчувальнае да святла... Правая галёнка пакрытая дваццаццю ранамі... Косці правай галёнкі раздробленыя ў сярэдняй і ніжняй частках, прычым раны буйных памераў ад 1 да $2\frac{1}{2}$ сантыметра, з кровападцёкам... На тыльнай паверхні правай ступні каля злучэння пальцаў з плюснявымі касцямі заўважаецца папярочная рана памерам на 7 сантыметраў, якая пранікае ў суставы. Верхняя частка левай галёнкі пакрытая ранамі скуры... Усяго на целе звыш пяцідзесяці ранаў... Дыхание паверхневае. Пульсу няма»*.

Пры царазабойцу неадлучна сядзеў следчы. За гадзіну перад смерцю да Ігната вярнулася прытомнасць. «Як ваша імя?» — запытаўся следчы. «Не ведаю», — адрывіста адказаў тэрарыст.

Гэта былі апошнія Ігнатавы словы. А палове адзінаццатай вечара дактары канстатавалі смерць,

Ідзіце!.. Датрываю муку
адзін, без крыўды на сяброў.
Хай застанецца мая кроў
па жорсткім пецярбургскім бруку.
Сумленнем чысты перад Богам,
я праўды ведаю цану.
Дык не пытайцеся, чаму
падняў руку я на «самога».

Так праз 110 гадоў напіша пра перадсмяротныя хвіліны Ігната Грынявіцкага беларускі паэт Алесь Каско.

1 сакавіка на Кацярынінскім канале былі таксама смяротна параненыя казак Аляксандр Малейчаў (памёр у той самы дзень) і чатырнаццацігадовы Мікалай Захараў, хлопчык з мясной крамы (памёр 3 сакавіка).

Шэсць чалавек атрымалі цяжкія раны, адзінаццаць — лёгкія. Некаторыя страцілі зрок, слых, засталіся калекамі. Адной з параненых, салдацкай жонцы Еўдакіі Давыдавай, зрабілі ў Марыінскай бальніцы тры аперацыі, але яна дажыла толькі да траўня**.

Праз год пасля трагічнай гібелі І. Грынявіцкага ў Вольнай расейскай друкарні ў Лондане ўпершыню быў апублікаваны ягоны жыццяпіс.

* *На месцы забойства Аляксандра II збудаваны храм-помнік Спаса на крыві. Недалёка ад яго, на Грыбаедаўскім канале, цяпер знаходзіцца мост імя І. Грынявіцкага.*

* *Голос. 1881. 17 красавіка.*

** *Дневник событий с 1 марта по 1 сентября 1881 года // 1 марта 1881 года: Казнь императора Александра II: Документы и воспоминания. Л., 1991. С. 53.*

Невядомы аўтар, відаць, нехта з таварышаў па арганізацыі, пісаў пра героя «Народнай волі»: «Гледзячы на яго, вайсковы чалавек успомніў бы правіла: «на службу не набівайся, ад службы не ўцякай», а нябожчык Дастаеўскі абавязкова ўбачыў бы ў Грынявіцкім галоўныя рысы свайго ўлюбёнага расейскага тыпу — багатую нутраную сілу ў лучнасці з найвялікшаю сціпласцю і поўнай адсутнасцю самалюбства.

Нягледзячы на гэта, Грынявіцкі быў не расеец. Сам сябе ён называў «ліцвінам», палякі ж лічылі яго сваім суайчыннікам; але гэта наўрад ці правільна, бо Грынявіцкі па-польску нават гаварыў дрэнна*, расейскаю ж мовою валодаў як прыроднай...

Ён рабіў справу, што, паводле яго перакананняў, была на карысць народу. Не прыпыніўшыся яшчэ ні на чым, ён браўся за ўсё... Ціхі, сціплы, ён, аднак, быў відаць паўсюль.

У студэнтаў меў агульную павагу, не закранаючы нічыйго самалюбства, ён на ўсіх уплываў, але ўплывам гэтым нікога не крыўдзіў і не абцяжарваў... Вагу ягоным думкам надавала сама ягоная асоба. Словы і ўчынкі ў яго ніколі не разыходзіліся паміж сабою, а думка набывала асаблівую трываласць дзякуючы глыбокаму і нейкаму арганічнаму перакананню: па-першае, што ўсё павінна існаваць дзеля народа і рабочых масаў; па-другое, што зрабіць нешта можна толькі моцнай барацьбой. Такое перакананне або, лепей сказаць, пачуццё жыло ў Грынявіцкага ўжо тады, калі ён яшчэ не зусім сфармаваўся як рэвалюцыянер.

Ён быў цудоўны таварыш і чалавек надзвычай добры і мяккі... Звычка да працы і ўменне задавальняцца малым у сваіх асабістых патрэбах давалі яму магчымасць вельмі шмат аддаваць тым, хто жыве ў нястачы... Зычлівасць Грынявіцкага і ягоная незвычайная цярплівасць у любой сумленнай спрэчцы яшчэ болей гарнулі да яго нават тых, хто з ім не пагаджаўся. Адзіная якасць, якую ненавідзеў Ігнат Якімавіч, было фразёрства: яго ён заўсёды выводзіў на чыстую ваду...

* *Гэты факт нідзе не пацвярджаецца і, відаць, не адпавядае сапраўднасці.*



Незвычайныя здольнасці Грынявіцкага да работы, ягоная рэдкая самаахвярнасць прымушалі старэйшых і спрактыкаваных людзей берагчы яго як вельмі каштоўную сілу. Ігнат Якімавіч «на службу не набіваўся», але прагнуў яе...

... Тое, што трэба зрабіць, ён рабіў так, як быццам на гэта была ягоная асабістая ахвота. Небяспечна ці не, прыемна ці непрыемна — розніцы яму не было. «Трэба зрабіць!» — і ён рабіў...

Але тыя, хто ведаў Ігната Якімавіча, бясспрэчна, адчуваюць смутак: ён вядомы толькі як чалавек, што паразіў тырана. Чаму ж не ведаюць яго як рэдкую маральную асобу, чаму гэтая чыстая, шчодрая і самаадданая душа не паспела выявіць сябе ўва ўсім сваім хараstве, чаму яна не можа служыць людзям маяком на шляху іх маральнага ўдасканалення?..»*

* *Биография Гринсвицкого // На родине. Лондон, 1882. № 1.*

# ПАСЛЯ ВЫБУХУ

*Няспраўджаныя надзеі * Паварот да рэакцыі * Разгром «Народнай волі» * Лёс таварышаў па барацьбе * Апазнанне царазабойцы * Пад таемныя наглядам паліцыі*

Успаміны нарадавольцаў сведчаць, што пасля забойства цара яны чакалі магутнага народнага паўстання. Але народы імперыі не ўспрынялі дый не маглі ўспрыняць тэрарыстычную акцыю на Кацярынінскім канале як сігнал да рэвалюцыі. Апрача некалькіх нязначных, пераважна студэнцкіх выступленняў, прыкметнай антыўрадавай дзейнасці не заўважалася.

У даволі рэдкіх шэрагах лібералаў панавалі страх, разгубленасць і чаканне рэпрэсій. Што да вышэйшых слаёў самаўладдзя, дык тут ніякіх сімптомаў дэзарганізаванасці (на што спадзяваліся рэвалюцыянеры) якраз і не было.

Імперыя прысягнула Аляксандру III, які даў велізарную ўладу обер-пракурору Сінода К. Пабеданосцаву. Гэты рэакцыянер, шавініст і прыхільнік моцнай дзяржаўнай рукі найперш ануляваў ужо практычна зацверджаную «канстытуцыю» Лорыс-Мелікава.

Скончылася палітычная кар'ера не толькі самога графа-рэфарматара, але і ўсіх больш-менш ліберальных міністраў, на змену якім прыйшлі адкрытыя рэакцыянеры-абскурантысты. Доўгія гады краіне было наканавана жыць у задушлівай атмасферы вялікадзяржаўнай дэмагогіі і паліцэйскага тэрору*. У паэме «Адплата» Аляксандр Блок пісаў пра той час:

* *Называючы царскую Расію паліцэйскай дзяржаваю, мы павінны разумець пад гэтым найперш выкананне паліцы-*



... Грянул взрыв
С Екатеринина канала,
Россию облаком покрыв.
Все издалека предвещало,
Что выпадет такая карта...
И этот века час дневной —
Последний — назван первым марта.

В те годы дальние, глухие,
В сердцах царили сон и мгла:
Победоносцев над Россией
Простер совиные крыла.

Востока страшная заря
В те годы чуть еще алела...
Чернь петербургская глазела
Подобострастно на царя...

Разгорнутая супроць рэвалюцыйнага руху энергічная дзейнасць дала свой плён. За тры-чатыры гады паліцыя разграміла «Народную волю» і арыштавала ўсіх яе кіраўнікоў, што не паспелі эміграваць. Блізу паловы сяброў Выканаўчага камітэта атрымалі смяротныя прысуды.

Першым вялікім працэсам нарадавольцаў стаў суд над арганізатарамі і выканаўцамі забойства Аляксандра II.

І ў часе следства, і потым, да апошніх хвілін жыцця, С. Пяроўская, А. Жалябаў, М. Кібальчыч, Ц. Міхайлаў і Г. Гельфман паказалі сябе людзьмі цвёрдымі ў перакананнях і мужнымі. У адрозненне ад іх М. Рысакоў ужо з першых допытаў пачаў выдаваць і быў гатовы дзейнічаць у якасці правакатара.

Нягледзячы на гэтыя заслугі Рысакова, прысуд быў аднолькавы: усіх пецярых чакала смерць на шыбеніцы.

*яй неўласцівых гэтаму ведамству функцый, умяшанне яе практычна ва ўсе сферы жыцця тагачаснага грамадства. Разам з тым маштабы паліцэйскай дзейнасці былі зусім іншыя, чым, напрыклад, у 30—50-я гады XX стагоддзя, калі бальшавіцка-сталінскі рэжым увязніў у лагерах і турмах мільёны бязвінных ахвяраў, над якімі стаяў шматмільённы рэпрэсіўны апарат. У канцы XIX стагоддзя ўсе турмы імперыі былі разлічаныя не болей чым на 100 тысяч зняволеных і ніколі, апрача гадоў першай расейскай рэвалюцыі, не былі запоўненыя цалкам. Яшчэ адна лічба для параўнання: у 1905—1909 гадах увесь штат пецярбургскай «ахранкі» налічваў 600—700 супрацоўнікаў.*

Пракурор Мураўёў (між іншым, гімназічны знаёмы Пяроўскай), які патрабаваў дзяржаўным злачынцам менавіта такое пакаранне, даводзіўся стрыечным унукам таму Мураўёву, што душыў на Беларусі і ў Літве паўстанне 1863 года.

За колькі дзён да смерці Соф'я Пяроўская пісала да маці: «Я пра свой лёс зусім не тужу, спакойна сустракаю яго, бо даўно ведала і чакала, што раней ці пазней, а так будзе... Я жыла так, як падказвалі мне мае перакананні; рабіць нешта супроць іх я проста не магла, таму са спакойным сумленнем чакаю ўсё, што ў мяне наперадзе»*.

Страта адбылася 3 красавіка 1881 года ў Пецярбурзе.

Гесі Гельфман, якая чакала дзіця, сярод павешаных не было. У выніку кампаніі пратэстаў смяротны прысуд замянілі ёй на вечную катаргу. Гесіна дзіця з'явілася на свет у доме папярэдняга зняволення. Дзяўчынцы далі нумар А-824 і перадалі яе ў сталічны выхаваўчы прытулак. Адмысловая рэзалюцыя забараняла дачцэ рэвалюцыянеркі мець у будучым сапраўднае прозвішча. Не стрываўшы расстання з дзіцём і турэмных пакутаў, Геся неўзабаве памёрла.

Трагічна скlaліся і жыцці іншых падпольшчыкаў — землякоў Грынявіцкага.

Рыгора Ісаева арыштавалі ў красавіку 1881 года і на працэсе дваццаці нарадавольцаў засудзілі да пакарання смерцю, якое было заменена вечнай катаргай. Праз пяць гадоў ён памрэ ад сухотаў у Шлісельбургскай фартэцы.

Антон Барэйша друкаваў і пашыраў пракламацыі пра смерць імператара. Пасля арышту ён больш за год сядзеў у казематах Петрапаўлаўскай фартэцы, а ў сакавіку 1883 года быў засуджаны на 15 гадоў катаргі і далейшае пажыццёвае пасяленне ў Сібіры.

Барэйша апынуўся сярод тых нешматлікіх нарадавольцаў, якія дажылі да савецкай улады і на свае вочы ўбачылі, якімі метадамі ў краіне пачынаецца будаўніцтва «новага справядлівага грамадства».

* *Письмо С. Л. Перовской к матери // «Народная воля» в документах и материалах. М., 1930. С. 251.*



Апошнім ударам, што канчаткова спыніў існаванне «Народнай волі», былі арышты 1885 года.

Як вядома, спробу аднавіць палітычны тэрарызм зрабілі ў 1887 годзе Аляксандр Ульянаў і купка ягоных аднадумцаў — пецярбургскіх студэнтаў.

Гэтая рэвалюцыйная група імкнулася аб'яднаць народніцкія погляды з марксісцкімі, падкрэслівала вырашальную ролю рабочага класа, але адзіным сродкам заваёвы палітычнай свабоды лічыла тэрор. Арыштаваны ў часе падрыхтоўкі замаху на Аляксандра III, Ульянаў і чацвёра ягоных паплечнікаў былі павешаныя ў Шлісельбургскай фартэцы.

Але звернемся да падзей вясны 1881 года.

Паліцыі, нягледзячы на вялікія намаганні і дапамогу М. Рысакова, доўга не ўдавалася выявіць сапраўднае імя царазабойцы. Яно не гучала і на працэсе па справе Пяроўскай, Жалябава і іншых.

З сакавіка ў пакоі «віленскага мешчаніна Ельнікава» на Сімбірскай вуліцы паліцыя ўчынілаператрус. «Трафэі» былі небагатыя: шэсць асобнікаў «Рабочай газеты», «Программа рабочих членов партии «Народной волі» і забытая Рысаковым насоўка з ягонымі ініцыяламі. Напярэдадні яму і Жалябаву паказалі цела тэрарыста, што сканаў у Канюшаным шпіталі. Жалябаў даваць тлумачэнні адмовіўся, Рысакоў апазнаў свайго таварыша па падполлі, вядомага як Міхаіл Іванавіч, або Коцік.

Паліцыя зрабіла з нябожчыка фотаздымкі, пасля чаго яго абезгаловілі. Фатаграфіі разаслалі па навучальных установах і ва ўрадавыя газеты. Адцятую ад мёртвага цела галаву змясцілі ў шкляную пасудзіну са спіртам, каб выстаўляць у паліцэйскіх упраўленнях і паказаць усім сталічным дворнікам. Гэтую галаву, у прыватнасці, бачыў зняволены ў Петрапаўлаўскай фартэцы рэвалюцыянер-народнік Дз. Клеменц.

Пад час паказу паліцэйскіх здымкаў імя царазабонцы «не ўзгадалі» ні Пяроўская, ні Кібальчыч, ні Гельфман.

Разам з тым фотакарткі паказвалі не толькі ахвярам новых арыштаў, але і выкладчыкам і студэнтам Тэхналагічнага інстытута, а таксама сваякам у

Вялікіх Грынявічах — усё ж паліцыя з першых дзён падазравала ў тэрарысце Ігната Грынявіцкага.

Канчатковае высвятленне асобы царазабойцы адбылося ў красавіку 1881 года. Арыштаваны нарадаволец М. Калядкевіч на паказаным яму здымку прызнаў чалавека, вядомага яму пад мянушкаю Коцік, «прозвішча якога, калі пе памыляецца, Грынявіцкі». Жандарскі генерал А. Камароў 23 красавіка па-казённаму мудрагеліста пісаў у сваім данясенні: «У часе далейшых росшукаў па выяўленні сапраўднага імя чалавека, які памёр 1 сакавіка гэтага года ў прыдворным Канюшаным шпіталі і, як потым раскрылася, жыў пад імем Ельнікава, меркаванне, што ўзнікла на аснове дзіўнага падабенства Ельнікава з былым студэнтам С.-Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута, механічнага аддзялення (каталіцкага веравызнання) Ігнатам Грынявіцкім, цалкам пацвердзілася як наказам яго фатаграфічнай карткі старэйшаму наглядчыку за навучэнцамі ў С.-Пецярбургскім тэхпалагічным інстытуце надворнаму саветніку Момбелю, так і студэнту таго ж інстытута Антону Гаўронскаму, якія ў знятай з Ельнікава картцы прызналі Ігната Грынявіцкага.

Апрача таго, фатаграфічная картка чалавека, што называў сябе Ельнікавым, была паказаная на месцы радзімы Грынявіцкага ў Гарадзенскай губерні Бельскага павета, у маёнтку Грынявічы Вялікія, як родным Грынявіцкага, так і асобам, што яго ведалі, прычым усе гэтыя асобы, акрамя бацькі Грынявіцкага, які даў уніклівы адказ, заявілі, што на паказанай картцы бачаць Ігната Грынявіцкага»*.

Бацька тэрарыста, відаць, хацеў адвесці небяспеку ад малодшага сына Яна — былога студэнта Пятроўска-Разумоўскай земляробчай і лясной акадэміі, а потым вольнапісанага 2-й гвардзейскай артылерыйскай брыгады, звольненага з вайсковай службы з прычыны палітычнай ненадзейнасці.

Паліцыя вярнула Яна Грынявіцкага ў бацькаў маёнтак і да чэрвеня 1888 года трымала над стро--м наглядам. Далейшы ягоны лёс невядомы.

* *Из докладов М. Т. Лорис-Меликова, В. К. Плеве, А. В. Комарова // 1 марта 1881 года: Казнь императора Александра II: Документы и воспоминания. Л., 1991. С. 215.*

# ЗАКАНЧЭННЕ

Гісторыя рэвалюцыйнага тэрарызму ў Расейскай імперыі (як, зрэшты, і ў іншых краінах) ведае рознае: авантурызм і самаахвярнасць, шляхетнасць і подласць... Але нідзе і ніколі тэрор не прынёс грамадству добрых пераменаў. Вынікам палітычных забойстваў нязменна былі няўпэўненасць у будучым, хаос, анархія і — прыход да ўлады рэакцыйных сілаў. А таму — як бы ні стараліся самі рэвалюцыянеры або гісторыкі апраўдаць тэрор спасылкамі на надзвычайныя абставіны, помстаю за злачынствы ўладаў— ніякага апраўдання яму няма.

Забойства Аляксандра II таксама прывяло да перамогі рэакцыі, спыніла рух імперыі па шляху рэформаў.

Савецкія гісторыкі, па сутнасці, кананізавалі думку, што Ленін і ягоныя паплечнікі асуджалі абраныя «Народнай воляй» сродкі барацьбы. Аднак такое сцвярджанне патрабуе ўдакладнення. Правадыр бальшавікоў пісаў пра нарадавольцаў наступнае: «Яны паказалі пайвялікшую самаахвярнасць і сваім *гераічным тэрарыстычным* (курсіў мой.— *У. А.)* метадам барацьбы здзівілі ўвесь свет. Несумленна, гэтыя ахвяры былі недарэмныя, несумненна, яны спрыялі — непасрэдна або ўскосна — далейшаму рэвалюцыйнаму выхаванню расейскага народа»*. Як мы ведаем, тэты «гераічны» метад (але ўжо ў агульнадзяржаўным маштабе) возьмуць сабе на ўзбраенне і самі бальшавікі.

Расейскія сацыял-дэмакраты на пачатку XX стагоддзя гэтаксама, як некалі народнікі, вялі дыскусію пра магчымыя шляхі і метады барацьбы.

* *Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 30. С. 315.*

Перамогу атрымалі прыхільнікі прынцыпу «мэта апраўдвае сродкі». Супроць ворага ўсе сродкі былі не толькі дазволепыя, але — добрыя. Хрысціянская мараль, пачуцці спагады і міласэрнасці бязлітасна адкідваліся, як рэчы непатрэбныя і шкодныя. «Такая ідэалогія садзейнічала прытоку ў рэвалюцыйнае асяроддзе разам з рамантыкамі, ідэалістамі, праўдалюбцамі, сумленнымі рэвалюцыянерамі і людзей з жорсткімі або нават з садысцкімі схільнасцямі. Забіць чалавека проста так — ганебна і небяспечна, забіць па палітычных матывах — ганарова і нават выгадна... П. З. Ермакоў (адзін з выканаўцаў забойства сям'і імператара Мікалая II — *У. А.)* па заданні партыі яшчэ ў 1907 годзе забіў паліцэйскага агента, але не проста забіў, а адрэзаў яму галаву. Рэвалюцыянер Ільюша Глухар, які таксама спецыялізаваўся на знішчэнні паліцэйскіх агентаў, забіваў іх абавязкова адным метадам — куляй у лоб, паміж вачэй»*.

У сваім запавеце Ігнат Грынявіцкі марыў пра тое, каб «пачаты рух скончыўся перамогаю, а не татальным вынішчэннем найлепшых людзей краіны». Чым скончыўся рэвалюцыйны рух у Расейскай імперыі ў XX стагоддзі, мы добра ведаем — чырвоным тэрорам, братазабойчай грамадзянскай вайной, жахамі ГУЛагу, генацыдам свайго ж народа...

Цяпер, калі з вышыні (ці, можа, дакладней — з бездані) нашага гістарычнага досведу мы пакутліва, але няўхільна пераасэнсоўваем гісторыю, адбываецца пераацэнка дзейнасці, а таксама саміх асоб рэвалюцыянераў-нарадавольцаў. Яны ўсё менш успрымаюцца як рыцары без страху і дакору. З пачуццём, далікатна кажучы, няёмкасці чытаем мы сёння такія радкі вядомага паэта:

Карэта цара выязджае.
(Гэткі на колах гадзючнік!)
У канале Кацьчыным воды
Да блізкага мора бягуць.
Вось бомба. Хай з падлы смярдзючай,
Хай з яго, ката народаў,
Ката маёй Беларусі
Зараз шматкі палятуць.
Выбух. Той здох. Але
І яго смерч асколкаў нізрынуў...

* *Платонаў А. Царазабойцы // Чырвоная змена. 1990. 24 лістапада.*

Сёння паэт, бадай, не напісаў бы так. Аўтар гэтае кніжкі таксама прайшоў праз перагляд ранейшых поглядаў на «Народную волю» і яе герояў і не хацеў бы, каб Ігнат Грынявіцкі служыў каму-небудзь «маяком па шляху маральнага ўдасканалення».

Сама гісторыя засведчыла: любыя спробы стварыць «новага чалавека», змяніць свет да лепшага праз сілу — асуджаныя па няўдачу, што аплочваецца нязмернымі чалавечымі пакутамі.

Ігнат Грынявіцкі і ягоныя паплечнікі былі ахвярамі аблуднага вучэння. Яны трагічна памыляліся, але яны вартыя нашай памяці.

Памяці, якая перасцерагае.

## ЗМЕСТ

ПРАДМОВА . . . . . . . . . . . . . . 5

НА ПАЧАТКУ ЖЫЦЦЁВАЙ ДАРОГІ . . . . 9

*Малая радзіма * Спадчына з тысячным доўгам * У сям'і * Пад музыку бацькавай скрыпкі * Беластоцкая гімназія * Неспакойная правінцыя * Найлепшы выпускнік*

ТЭХНАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ . . . . . . . 14

*Мары здзяйсняюцца * Традыцыі вальнадумства * Студэнты і народніцкі рух * Экзамены і адзнакі * «Пакінуць на паўторны курс» * Данясенне быхаўскага прыстава*

ВЫБАР ЗРОБЛЕНЫ . . . . . . . . . . . 21

*Крывавае нецярпенне * Ігнат Грынявіцкі — нарадаволец * «Калі вы пойдзеце ў лес, я буду з вамі» * На нелегальным становішчы * Віленскі мешчанін Ельнікаў * «Рабочая газета» * Паплечнікіземлякі*

ПАЛЯВАННЕ НА ІМПЕРАТАРА . . . . . . 27

*Асоба Аляксандра II * Прысуд нарадавольцаў * Няўдалыя замахі * Праекты графа Лорыс-Мелікава * Сёмая спроба * Падкоп на Малой Садовай * Чацвёра з 47 * Развітанне з радзімай * Кватэра на Сімбірскай вуліцы*

ПЯРЭДАДЗЕНЬ . . . . . . . . . . . . 34

*Арышт Жалябава * Выпрабаванні выбуховых прыстасаў * Надзвычайнае пасяджэнне Выканкама * Запавет Грынявіцкага * «Раскошнае дрэва свабоды eымагае ахвяраў»*

1 САКАВІКА 1881 ГОДА . . . . . . . . 37

*Сустрэча на Цялежнай * Даклад міністра ўнутраных спраў * Імператар мяняе маршрут * Выбухі на Кацярынінскім канале * Смерць імператара * Апошнія гадзіны Грынявіцкага * Нявінныя ахвяры.*

ПАСЛЯ ВЫБУХУ . . . . . . . . . . . . 44

*Няспраўджаныя надзеі * Паварот да рэакцыі * Разгром «Народнай волі» * Лёс таварышаў па барацьбе * Апазнанне царазабойцы * Пад таемныя наглядам паліцыі*

ЗАКАНЧЭННЕ . . . . . . . . . . . . . 49

НАШЫ СЛАВУТЫЯ ЗЕМЛЯКІ
Серыя акадэмічная

Научно-популярное издание

**Орлов Владимир Алексеевич**

**ПРИГОВОР ПРИВЕЛ В ИСПОЛНЕНИЕ НЕИЗВЕСТНЫЙ:**
ИГНАТ ГРИНЕВИЦКИЙ

Минск, издательство «Навука і тэхніка»

*На белорусском языке*

Iавукова-папулярнае выданне

**Арлоў Уладзімір Аляксеевіч**

**ПРЫСУД ВЫКАНАЎ НЕВЯДОМЫ:**
ІГНАТ ГРЫНЯВІЦКІ

Загадчык рэдакцыі М. З. Гссь
Рэдактар Л. А. Коржава
Мастак Т. П. Кулажэнка
Мастацкі рэдактар В. А. Жахавец
Тэхнічны рэдактар Л. А. Карнеева
Карэктар І. Л. Дзмітрыенка

ІБ № 4051

Здадзена ў набор 21.04.92. Падпісана ў друк 23.07.92. Фармат 84X100$^1/_{32}$ Папера друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 2,73+0,78 укл. на крэйд. пап. Ум. фарб.-адб. 3,72. Ул -выд. арк. 2,75. Наклад 14 500 паасобнікаў. Зак. № 458. Кошт 1 р. Выдавецтва «Навука і тэхніка» Акадэміі навук Беларусі і Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. 220067. Мінск, Жодзінская, 18. Друкарня імя Францыска Скарыны выдавсцтва «Навука і тэхніка». 220067. Мінск, Жодзінская, 18.